БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

№ 36
СЬНЕЖАНЬ
1930 г.

Вучні сямігодкі на працы ў чыгуначных майстэрнях у Менску.

Фото Мизелева.

„Падняць ролю саветаў у правядзеньні на практыцы Ленінскай лініі партыі—асноўная палітычная задача перавыбарчай кампаніі“

(З пастановы сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК Усе КП(б).

Заможнікам не ўдалося ашукаць выбаршчыкаў.

На перавыбары сельсавета ў вёсцы Мядзьведзева зьявілася 95 працэнтаў выбаршчыкаў. На сходзе былі ўсе жанчыны, дзяцей аднесьлі ў яслі, якія былі зарганізаваны на гэты вечар.

Заможная частка напружыла ўсю сваю энэргію, каб падарваць гэтую справу. У час абгаварэньня кандыдатур, яны высоўвалі сваіх людзей-заможнікаў, але ж ім далі належны адпор: у новы склад сельсавету прайшлі кандыдатуры, якія раіліся ячэйкай КП(б)Б і сходамі беднаты. Таксама хацелі заможнікі падарваць працу ясьляў, каб жанчыны-бяднячкі і калгасьніцы ня прысутнічалі на сходзе. З гэтай мэтай, адна жанчына крыкнула: „дзеці пачадзелі!“ і жанчыны пайшлі ў яслі да дзяцей. Дзеці ўсе спалі, быў устаноўлены належны дагляд за імі. Пабачыўшы, што іх ашукалі, жанчыны прышлі зноў на сход. Такім чынам, варожаму элемэнту не ўдалося сарваць сходу.

Фішман Б., Кішко Трахім.

Калгасьніцы дапамагаюць выканаць пяцігодку.

На агульным сходзе ў калгасе імя „10-ці годзьдзя БССР“ стаяла пытаньне аб падпісцы на пазыку „пяцігодка ў чатыры гады“.

Калгасьніцы адгукнуліся на падпіску і падпісаліся на 5 рублёў кожная.

Калгасьнікі і калгасьніцы выклікаюць усе калгасы пасьледваць іх прыкладу.

Магілеўскі раён. **Г. М.**

Працоўныя жанчыны актыўна ўдзельнічалі ў перавыбарах

У Чараноўшчанскім сельсавеце праведзены тры сходы жанчын, прысьвечаных справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў. Яўка жанчын даходзіла да 90—95 процантаў. На сходах ставілася справаздача сельсавету. Жанчыны выступалі, адзначаючы недастатковую працу сярод жанчын і беднаты і актыўна абгаварвалі кандыдатуры ў новы склад сельсавету.

У дні перавыбараў былі арганізаваны аднадзённыя дзіцячыя яслі. Настаўніца Сарзоўскай школы **Шклярова** дапамагала арганізацыі ясьляў. Уражаньне сялянак ад ясьляў добрае.

У Кублічах местачковым саветам таксама праведзен сход жанчын; у аднадзённых дзіцячых ясьлях было 30—35 дзяцей.

Вушацкі раён. **Гінзбург Я.**

Калгасьніца Шкутова—актыўная сельсаветчыца.

У складзе Цяцерынскага сельсавету маецца калгасьніца Шкутова Параскоўя.

Шкутова — адна з перадавых калгасьніц. Ёй ужо 50 год, але, ня гледзячы на такі ўзрост, яна працуе ў калгасе па-ўдарнаму.

Шкутова некалькі год была дэлегаткай. Як сябра сельсавету яна выконвала сумленна працу, ускладзеную на яе. **Д.**

Круглянскі раён.

Кулацкі напад на грамадчыцу.

У ноч на 10-е сьнежня кулаччо Стрэлішчынскага сельсавету напала на старшыню гэтага савету жанчыну Абляцову М. і нажом цяжка параніла яе. Частка кулакоў затрымана, тэрмінова вядзецца сьледзтва.

Таварыш Абляцова Матруна Герасімаўна—бяднячка вёскі Вяжычына, кандыдат партыі і сябра калгасу „Барэц“, скончыла лікпункт і чатыры разы абіралася ў склад сельсавету.

На цэнтральных курсах пры ЦВК па падрыхтоўцы жанчын старшынь сельсаветаў Абляцова была актыўнай і добра пасьпяваючай курсанткай. У раёне яна лічыцца аднэй з лепшых актывістак—грамадчыц. Таварыш Абляцова, будучы дэлегаткай, многа працавала па арганізацыі дзіцячых ясель, пляцовак, пасьпяхова распаўсюджвала часопісь „Беларуская Работніца і Сялянка“.

Працоўныя масы патрабуюць жорсткага пакараньня віноўных.

Мікуліч.

Сельсаветчыца Навашчынская з працай справілася.

У абгаварэньні пытаньня аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі сельсаветаў на дэлегацкім сходзе прымалі актыўны ўдзел ня толькі калгасьніцы-дэлегаткі, але таксама і адзінаасобніцы-сялянкі, якія ў сваіх выступленьнях у спрэчках паказалі, што яны значна палітычна выраслі супроць мінулых гадоў. Пры абгаварэньні кандыдатуры адзінагалосна прынята кандыдатура сучаснага члена Апчацкага сельсавета—калгасьніцы Навашчынскай Анюты. Год таму назад, калі яе выбралі ў члены сельсавета, яна неяк боязна ішла на гэтую працу. Яна ня была ўпэўнена ў сваіх сілах, бо ня была знаёма з гэтай працай. Але год упартай работы і жаданьне быць карыснай грамадчыцай перамагло і цяпер упэўнена можна сказаць, што Навашчынская Анюта будзе клясава-вытрыманым і карысным сябром сельсавету. **Шаціла.**

Сьмілавіцкі раён.

На зьезьдзе працоўных жанчын Нямеччыны. На здымку: заля пасяджэньня ў момант паведамленьня аб выкрыцьці эмовы імпэрыялістых супроць СССР.

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

№ 36 | СНЕЖАНЬ | 1930 г.

Пяцігодка перамагае

Мы ўступаем у трэці год пяцігодкі. Пройдзеныя два гады пяцігодкі яскрава сьведчаць аб вялізарных дасягненьнях рабочай клясы, якая пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, абапіраючыся на калгасьнікаў і беднату, будуе сацыялізм, у цесным саюзе з асноўнымі масамі сялянства.

Буржуазія капіталістычных краін, клясавыя ворагі ўнутры нашай краіны, сустрэлі пяцігадовы плян з шалёнай нянавісьцю, яны крычалі, што мы ня справімся з выкананьнем пяцігодкі. Жыцьцё апракінула іх сьцьвярджэньне.

Клясавыя ворагі ўсімі сіламі імкнуліся перашкодзіць ажыцьцяўленьню пяцігадовага пляну; шкодніцкай работай на вытворчасьці, транспарце і ў сельскай гаспадарцы, яны спрабавалі сарваць выкананьне пяцігодкі.

Супроць пяцігодкі выступалі таксама правыя і „левыя" ўхілістыя, якія, палохаючыся труднасьцяй росту сацыялістычнай гаспадаркі, патрабавалі зьнiжэньня тэмпаў сацыялістычнай будоўлі.

Але за пяцігодку прагаласавалі мільённыя масы рабочых і работніц, калгасьнікаў і працоўнага сялянства. Яны высунулі баявы лёзунг: „пяцігодку за чатыры гады" і стварылі новыя камуністычныя формы працы, як сацыялістычнае спаборніцтва, ударніцтва, сустрэчны прамфінплян, якія забясьпечылі посьпехі першых двух год пяцігодкі.

Мы за мінулы 1929-30 год маем прырост прамысловасьці Савецкага Саюзу на 25 процантаў (чацьвертая частка), а па БССР капітальнае будаўніцтва павялічылася на 73,7 процантаў, гэта значыцца, вышэй намечанага па пяцігодцы на 12 процантаў. Беспрацоўе канчаткова ліквідавана, толькі па БССР мы маем прырост рабочых у прамысловасьці на 47,2 проц. альбо звыш чым на 24 тысячы чалавек.

Мы маем вялізарныя посьпехі ў справе сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. Шырокія масы бядняцка-серадняцкага сялянства рашуча павярнулі на шлях калектывізацыі. Аб гэтым выразна паказвае рост калгасаў, якія па СССР ахопліваюць 24,1 процанты бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, толькі ў час асеньняй сяўбы пасеўная плошча вырасла на 2 мільёны гектараў, а пасеўная плошча па БССР у сацыялістычным сэктару (калгасы і саўгасы) павялічылася з 5,5 процантаў да 18 проц.

Такім чынам ва ўсіх асноўных галінах мы маем вялізарнае паскарэньне тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва і пытаньне „хто каго" ў прамысловасьці вырашана канчаткова і беспаваротна ў карысьць сацыялістычнай прамысловасьці.

Праводзячы разгорнутае сацыялістычнае наступленьне па ўсяму фронту, ліквідуючы кулацтва як клясу, на аснове суцэльнай калектывізацыі, мы пасьпяхова перамагаем труднасьці сацыялістычнага будаўніцтва.

Савецкі саюз уступіў у паласу сацыялізму. Гіганцкія задачы стаяць перад намі ў трэцім годзе пяцігодкі.

У 1931 годзе мы павінны палучыць прырост прадукцыі прамысловасьці на 45 процантаў, а па БССР валавая прадукцыя прамысловасьці павінна вырасьці на 104 процанты (у два разы). У трэці годзе пяцігодкі ўступяць у строй цэлы шэраг уноў пабудаваных прадпрыемстваў—гігантаў. Вытворчасьць трактараў ужо ў 1931 годзе павялічыцца да 53 тысяч—гэта значыць, што пяцігодка будаўніцтва трактароў будзе выканана ў тры гады.

Гэты рост прамысловасьці, посьпехі ў справе сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі забясьпечваюць далейшае разгортваньне суцэльнай калектывізацыі. Калектывізацыяй трэба ахапіць палову ўсіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, а па Беларусі 45 процантаў.

Новы моцны прыліў беднякоў і сераднякоў у калгасы, які мы зараз маем, гаворыць аб тым, што мы з гэтай задачай спраўляемся.

Мы ўступаем у трэці год пяцігодкі ва ўмовах абвострыўшайся ваеннай небясьпекі; выкрыцьце плянаў інтэрвэнцыі, у сувязі з судом над шкоднікамі ня зьнімае пагрозы вайсковага нападу, бо буржуазія ня спыняе, а наадварот павялічвае падрыхтоўку да новых імпэрыялістычных боек. Вось чаму рабочая кляса і мільённыя масы працоўных Савецкага Саюзу яшчэ больш узмацняюць свае сілы, каб пасьпяховым выкананьнем пяцігодкі ўмацоўваць абароназдольнасьць краіны Саветаў.

Работніцы, калгасьніцы і працоўныя жанчыны, павінны яшчэ больш узмацніць свой удзел у сацыялістычным спаборніцтве, арганізацыі ўдарных брыгад, бо гэта неабходная ўмова выкананьня пляну трэцяга году пяцігодкі. Сур'ёзную ўвагу неабходна ўдзяліць справе падвышэньня якасьці выпускаемай прамысловасьцю прадукцыі і зьніжэньню сабекошту, бо ў гэтай галіне мы ня выканалі поўнасьцю пляну ў другім годзе пяцігодкі (па БССР зьніжэньне сабекошту было вызначана 11 процантаў, а фактычна маецца 8 процантаў). Актыўным удзелам у вытворчых нарадах работніцы павінны дабівацца паляпшэньня вытворчасьці, павышэньня якасьці прадукцыі і зьмяншэньня браку. Работніцы павінны актыўна змагацца за выкананьне сустрэчнага на 1931 год.

Вялікія задачы стаяць перад калгасьніцамі: узорнай працай у калгасе яны павінны дабівацца пры-

Т. Галадзед робіць даклад на сэсіі ЦВК аб задачах трэцяга году пяцігодкі.

ліву новых членаў у калгасы. Змагаючыся супроць кулацкай агітацыі калгасьніцы, дэлегаткі-сялянкі павінны дапамагаць ваўлячэньню бяднячак і сераднячак ў калгасы з тым, каб у веснавую пасеўную кампанію гэтага году мы мелі па Беларусі 30 процантаў бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у калгасах.

Важнейшай задачай зараз зьяўляецца пашырэньне жывёлагадоўлі і тэхнічных культур. Тут таксама значную работу павінны правесьці калгасьніцы, бядняч кі і сераднячкі на вёсцы. Пашыраючы жывёлагадоўлю, павялічваючы пасеў ільну, канаплі, мы хутчэй справімся з труднасьцямі снабжэньня працоўных мас прамтаварамі і прадуктамі харчаваньня.

Трэці год пяцігодкі дасьць яшчэ большае пасіленьне тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, бо толькі паскарэньне тэмпаў—адзіна-правільны шлях перамаганьня труднасьцяй нашага росту.

Партыя дабілася значных посьпехаў, вядучы няпрымірымую барацьбу на два франты з правым ухілам, які найбольш небясьпечны ў даны пэрыяд і „левым“ трацкісцкім ухілам. Згуртоўваючы вакол генэральнай лініі партыі мільённыя масы рабочых, работніц і ўсіх працоўных, партыя прывядзе нашу краіну да перамогі ў барацьбе за пяцігодку ў чатыры гады.

Рыхтуемся да 3-га году пяцігодкі

Камуна „Індустрыя“ выканала заданьні

Маецца новы прыліў

Асеньняя сяўба ў нашай камуне скончана сваячасова, пасеўплошча павялічылася за лік распрацоўкі аблогаў і залежы на 7 процантаў.

У час асеньняга севу ў камуну ўступіла 2 бядняцкіх сямейства і адно батрацкае. З астатняй часткай адзінаасобнікаў узаемаадносіны добрыя.

Камуна ў верасьні месяцы з'арганізавала сваю сталоўку і палепшыла працу дзіцячага сада і ясьляў. Зараз камуна налічвае 30 сямейств.

Узрасла гаспадарка камуны ў параўнаньні з мінулым годам: кароў было 27 штук, а зараз 57 цельных кароў і 23 маладняку. Было каля 20 штук сьвіней, а зараз маецца 120 штук палурослых і дарослых сьвіней і каля 80 штук парасят. Зараз заканчваецца пабудова сьвінарніку на 100 штук сьвінаматак.

Хлебазагатоўкі камуна выканала на 100 процантаў. Перададзена другім калгасам чыстасортных сямян 1000 пудоў жыта і здана капэратыву 500 пудоў, а 1200 пудоў бульбы здана сваячасова пралетарскім цэнтрам.

З гародніны здана капусты 1000 пудоў, яблык 150 пуд. Загатоўкі ільнавалакна яшчэ ня скончаны, улетку пабудавана мачыльная яма і прыступлена да пабудовы ільно-апрацоўчага заводу.

У працы камуны многа дапамагае парт'ячэйка, дрэнна працуе ячэйка КСМ і дэлегацкі сход новага складу.

Дэлегатка.

Добрай працай калгасьнікаў ствараем новы прыліў у калгасы

У Цяцерынскім сельсавеце Круглянскага раёну маецца 5 калгасаў; асенняя сяўба і ўборка ўраджаю ў гэтых калгасах на справе даказала перавагу калектыўнай працы. Вынікам гэтага зьяўляецца новы калгасны прыліў.

Па сельсавету арганізаваны два новых калгасы у вёсках Глыбокае і Касьцюковічы; ёсьць прыліў і ў існуючыя. Так, у калгас „Чырвоныя прудкі“, падалі заявы аб уступленьні сяляне пасёлку „Зялёная Рошча“. У калгасе „Чырвоная Горка“ ўступіла 3 новых сябры, і тры ў калгас „Беларусь“. Шмат якія беднякі і сераднякі вёскі Ўлужжа жадаюць арганізаваць у сваёй вёсцы калгас і ўжо запрашалі мясцовых партыйных кіраўнікоў для арганізацыі гэтага калгасу.

Гэты вынік мы маем дзякуючы ўпартай працы калгасьнікаў і калгасьніц.

Д.

Дапамагаюць ліквідацыі прарываў

Дэлегацкі сход работніц і жонак рабочых гуты „Праца“ ў адказ на вылазкі контрэвалюцыйнай групы нацыянал-дэмакратаў бярэ на сябе наступныя абавязкі: вывучыць вайсковую справу, правесьці дадатковую падпіску на пазыку „пяцігодка ў чатыры гады“ і распаўсюдзіць яе сярод неарганізаваных жанчын. Усе дэлегаткі абвясьцілі сябе ўдарніцамі, арганізавалі брыгаду з мэтаю дапамогі ліквідацыі прарываў на гуце.

Павысім прадукцыйнасьць працы ў калгасе

Дэлегацкі сход калгасаў „Шляхі Леніна“ і „Прамень Леніна“ ў адказ на дзейнасьць контрэвалюцыйнай групы нацыянал-дэмакратаў абавязуецца: прыняць актыўны ўдзел у перавыбарах саветаў, павысіць прадукцыйнасьць працы ў калгасе, завербаваць новых калгасьнікаў.

Дэлегаткі бяруць на сябе абавязак правесьці падпіску на пазыку „пяцігодка ў чатыры гады“ і збор сродкаў на пабудову дырыжабля „Праўда“.

Пітугіна.

Рыхтуйцеся да новай калгаснай вясны

Значэньне вясновай пасеўнай кампаніі 1931 году вялізарнае. Пасьпяховае выкананьне пастаноў XVI зьезду УсеКП(б) і XIII зьезду КП(б)Б шчыльна зьвязана з правядзеньнем вясновай сяўбы. У барацьбе камуністычнае партыі і працоўных за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, задачы, што намечаны для правядзеньня ў час вясновай сяўбы, займаюць важнейшае месца.

Вось чаму нам неабходна ўжо зараз разгарнуць самую напружаную і актыўную падрыхтоўку да вясновай кампаніі. Посьпех падрыхтоўкі залежыць ад таго, паколькі ў яе будуць уцягнуты самыя шырокія масы калгасьнікаў і бядняцка - серадняцкага сялянства, а таксама і рабочых. Наша задача ў першую чаргу заключаецца ў тым, каб пляны вясновай сяўбы поўнасьцю ў вызначаны тэрмін давесьці да кожнага калгасу і саўгасу, да кожнай вёскі і ў парадку самаабавязацельстваў да кожнага двара. У абгаварэньне плянаў пасеўнай кампаніі павінны быць уцягнуты ўсе рабочыя і работніцы саўгасаў, калгасьнікі і бядняцка-серадняцкае сялянства. Для работы па абгаварэньню плянаў трэба шырока скарыстаць справаздачна - выбарчую кампанію саветаў. Трэба зрабіць усё для таго, каб кожны калгас і вёска вялі ўпартую барацьбу за выкананьне і перавыкананьне плянаў.

Пасеўная кампанія павінна прайсьці пад лёзунгам арганізацыі магутнага прыліву бядняцка-серадняцкіх мас у калгасы. Зараз ужо на вопыце даведзены ўсе перавагі калектыўнай гаспадаркі. Бядняцка - серадняцкае сялянства пераканалася, што для магутнага ўздыму сельскай гаспадаркі ёсьць адзін шлях—гэта шлях калектывізацыі.

За апошнія часы маем усё большае і большае нарастаньне прыліву. Аднак трэба сказаць, што праваапартуністычныя настроі самацёку яшчэ пануюць у шмат якіх арганізацыях. Мала робіцца для арганізацыі і павялічэньня калгаснага прыліву. Ёсьць людзі, якія ўсякую работу па арганізацыі калгаснага прыліву разглядаюць як адміністраваньне і перагібы.

Такім чынам, арганізацыя новых калгасаў і павялічэньне прыліву ў арганізаваныя—павінна пранізаць як усю практычную работу па падрыхтоўцы да вясновай сяўбы, гэтак і па яе правядзеньню. Рашуча змагаючыся з настроямі самацёку, з правымі апартуністымі і з „левымі“ загібшчыкамі, якія думаюць „в два счета“ выраішыць задачы калектывізацыі, нам трэба, на аснове саблюдзеньня поўнай дабраахвотнасьці, у час вясновай пасеўнай кампаніі разгарнуць вялікую работу па калектывізацыі,

У пастановах ЦК КП(б)Б і ўраду БССР па пытаньню аб вясновай пасяўной кампаніі намечана шэраг мерапрыемстваў.

Нам трэба шырока растлумачыць гэтыя пастановы шырокім масам калгасьніц і бядняцка-серадняцкіх мас сялянак, з тым, каб арганізаваць іх вакол выкананьня намечаных задач.

Разам з узмацненьнем і пашырэньнем існуючых калгасаў, а таксама арганізацыяй новых, неабходна разгарнуць значную работу па ўцягненьню бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у вытворчыя кааперацыйныя аб'яднаньні. Разгортваньне жывёлагадоўчых, малочных і іншых таварыстваў зьяўляецца важнейшай задачай. Нам трэба кіравацца ўстаноўкай на тое, каб ахапіць у асноўным усе бядняцка-серадняцкія гаспадаркі, што не ўвайшлі яшчэ ў калгасы, гэтымі вытворчымі таварыствамі.

Пры правядзеньні вясновай сяўбы, неабходна ўсё зрабіць для **пашырэньня пасеўнай плошчы яравых культур (намечана пашырэньне на 17 працэнтаў), і асаблівае пашырэньне засеву тэхнічных культур (лён, канапля),** якія зьяўляюцца сыравой базай для нашай прамысловасьці. Задача пашырэньня і ўзмацненьня жывёлагадоўлі патрабуе асаблівай увагі

Калгасьнікі рыхтуюцца да вясновай сяўбы.

для павялічэньня пасеву бульбы, корняклубняплодаў, аднагадовых траў і сіласных культур. Апошняе мае асаблівае значэньне для разьвіцьця малочнай жывёлагадоўлі і прамысловай сьвінагадоўлі.

Паранейшаму перад намі стаіць задача павялічэньня ўраджайнасьці, адсюль больш увагі правядзеньню аграмінімуму, забесьпячэньню 100-процантнай ачысткі насеньня, засеў гатунковым насеньнем і шэраг іншых мерапрыемстваў. Намечаныя кантрольныя лічбы для ўзьняцьця ўраджайнасьці павінны быць абавязкова выкананы.

У пасьпяховым выкананьні задач вясновай кампаніі набывае вялікае значэньне рамонт сельска-гаспадарчага інвэнтару. Ужо зараз неабходна прыняць усе захады да арганізацыі рамонтных майстэрняў; дапаможнікамі ў гэтай справе павінны зьявіцца рабочыя брыгадзіры.

Вялікая работа ўскладаецца на прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі. Гэты ўдзел павінен заключацца ў стварэньні брыгад з рабочых і работніц, жонак рабочых і камсамольцаў па рамонту сельска-гаспадарчых машын, у ачыстцы насеньня, у ажыўленьні работы вытворчых нарад пры саўгасах і калгасах, у разьвіцьці сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Пасьпяхова выконваць задачы, якія стаяць перад намі ў вясновую пасеўкампанію, мы зможам толькі пры шырокім разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Сацспаборніцтва трэба разгарнуць паміж калгасамі, саўгасамі і вёскамі, паміж асобнымі рабочымі і работніцамі саўгасаў і калгасьнікамі з тым, каб поўнасьцю выканаць і перавыканаць задачы вясновай сяўбы.

На аснове барацьбы за генэральную лінію нашай партыі правядзем па бальшавіцку другую калгасную вясну і разгорнем сацэльную калектывізацыю бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і на гэтай аснове ліквідуем кулацтва як клясу. Міх. Л.

Баявы савет

Рэчка—бягушка
ў берагі уціснута,
скована лёдам
маўчыць.
Узгорак пільнуе
хвойнік,
навіс ён
хмурым, панурым
ўначы.

Сьпіць нярухома
хвойнік іглісты,
вянкі з крышталікаў
тчэ.
Брыжы-галіны
Нізанкі маністаў
іскрацца, звоняць
ў парчы.
Перабірае
нехта струны
сьвіст злы, а сьледам
раскацісты сьмех.
Хаты і поле,
лес і гумны
рупна атулены
ў снег.
Замуравала
ўзорамі шыбы,
пяром упрыгожыла
срэбных птах.
Месяц лупаты,
халодны, бы рыба,
гладзіць затрушаны
сьнегам дах.
Час зімовы
Закон свой ладзіць.
Дзень—ня скмеціш,
а ноч—бы дзьве
Толькі ў аднэй
знаёмай хаце
дню дачакаўся
ў лямпе сьвет.

* * *

Поўнач,
пяўні даўно прапелі...
У Гэлі думак
карагод.
У нашай
камунаркі Гэлі
заўтра сьвята—
важны сход.
Стома—прэч!
Запал бяз меры,
Думкі
ў стройныя палкі!
і алоўкам
на паперы
Гэля вяжа
вузялкі.
Год мінуў,
ні абыякі,—
буйных перамог
уклад.
Пра работу
сельсавету
Гэля заўтра

Калгасьніца Балцінская з калгасу імя Сталіна Барысаўскага раёну, якая прывітала сэсыю ЦВК.

дасьць даклад.
Гэля выкажа
пра справы,
што здабылі
ў барацьбе;
што над ворагаў
аравай
ўжо гучыць
хаўтурны сьпеў.
Тры калгасы новых
хвактам
сталі росту
нашых сіл.
Набыла камуна
трактар,
ў падарунак
за уціль.
Ўвосень, ўвесну
з новай песьняй
нікнуць межы
на палёх.

Група дэлегатак сэсіі ЦВК абгаварваюць кантрольныя лічбы на 1931 год.

У калектыўнай,
дружнай працы
мы знаходзім
шмат палёгк.
Раскулачылі пузатых,
ўраз абозам
здалі хлеб...
— Што-ж яшчэ казаць?
Ўсяобуч,
школа,
ў яськях больш патрэб.

Заўжды помнім,
войстрыць шаблю
вораг наш
Пуанкарэ.
На савецкі
дырыжабль
грашанят мы
сабярэм.
Сем гэктараў
абароны
мелі летась,
Узарэм
больш цяпер.
У адзін загоны—
наш адказ
Пуанкарэ.
Дрэмлюць штось
насьценгазэты.
Самакрытыку
даёш!
Зброя—друк
і вельмі меткі
бюракрату
ў сэрца нож.
Клюб ў царкве былой.
А шэфы
радыё нам правялі.
Толькі вось
рамонт патрэбен
невялічкі.
Кавалі
ўжо цяпер
плугі майструюць
задальгодзь
к вясне ў паход.
А насеньня
досыць будзе:
сартавое пусьцім у ход.
Ўчора пленум
пра ўсё гэта
даручыў мне
вам сказаць,
каб у новы
склад савету
нам сваіх людзей абраць.
Вораг ў шчыліне
пільнуе
заўжды нам
пашкодзіць рад.
У саветы накіруем
лепшых
з ударніцкіх
брыгад.

Калектывы—
наша мэта.

Мы з саўгасамі
радня,
баяздольныя саветы
лёзунг сёньняшняга
дня.
Тым, хто цісьне
ў кола дручча,
сёньня мы
дамо адбой...
Нам кампартыяй
даручана
кулакам даць
сьмертны бой.

* * *

Бліснуў агонь,
Гэля схамянулася
— Досьвітак ужо...
На сходзе працяг...
Вышла на двор
і на белым шуле
расквіў чырвоны,
агністы сьцяг.

Сьвята сёньня,
квітнее вуліца...
Гурт мужчын,
дзяўчат, кабет...
Сьнег музычыць.
У кажухі туляцца—
ідуць абраць
баявы савет.



Дэлегацыя калгасьніц Барысаўскага раёну, якая прывітала сэсію ЦВК БССР.

У адказ на падрыхтоўку імпэрыялістых, агентаў польскага фашызму да вайны ўзмацнім нашы сілы па выкананьню пяцігодкі

Напярэдні перавыбараў саветаў праходзіла раённая канфэрэнцыя калгасьніц і працоўных жанчын у Магілеве. Вось чаму дэлегаткі зьявіліся на канфэрэнцыю з наказамі ад шматлікіх сходаў калгасьніц, дэлегатак і працоўных сялянак.

З напружанай увагай выслухалі даклад. А потым вышла Штурхаева Каця, член прэзыдыуму сельсавету і ад працоўных жанчын 2-х Цішовак, яна перадала: „У адказ інтэрвэнтам мы сабралі на абарону краіны для пабудовы дырыжаблю 71 руб. 55 кап.". А за ёй тут-жа Лабянава Варка ад Буйніцкіх сялянак уносіць 73 рублі 64 капейкі, Гарбузова ад Ракузоўкі—30 руб. 20 кап. Па прапанове тав. Гельц канфэрэнцыя сабрала з свайго боку грошы на абарону.

Тав. Галянкова—работніца заводу „Пролетары" заявіла: „Мы зьбіраем гэтыя грошы, каб умацоўваць абарону і яны будуць меткім стрэлам па ворагу".

Канфэрэнцыя з абурэньнем патрабавала суровага пакараньня агэнтаў польскага фашызму—нацыянал-дэмакратаў. „У адказ інтэрвэнтам, шкоднікам, якія рыхтавалі новую бойку супроць краіны Саветаў, морам крыві імкнуліся затапіць СССР, мы адкажам згуртаваньнем нашых радоў вакол Камуністычнай партыі, узмацненьнем ворганаў пралетарскай дыктатуры—саветаў"—заявілі ў сваёй пастанове дэлегаткі.

Работніца Князева, батрачка Альшэўская, калгасьніца Трахімава і яшчэ калгасьніцы—усяго 8 чалавек падалі заявы аб уступленьні ў рады Камуністычнай партыі.

Дэлегаткі абяцалі прыняць актыўны ўдзел у перавыбарах у саветы, уцягваючы ўсю масу працоўных жанчын на справаздачна-перавыбарчыя сходы, актыўна ўдзельнічаць у падборы кандыдатур у саветы.

Дэлегаткі абяцалі актыўна ўдзельнічаць у разьвіцьці калгаснай гаспадаркі, у ваўлячэньні батрачак і бядняцка-серадняцкіх жанчын вёскі ў калгасы.

Вось што гаварыла Казакова Ульяна з Хрэпелеўскага калгасу:

„Цяжка было мне бяднячцы ў адзіналічнай гаспадарцы. Бывала возьмеш у адну руку дзіцёнка, а ў другую вожкі і ідзеш за плугам. А цяпер у калгасе працуем агульнымі сіламі, мы будуем нашу гаспадарку і куды лягчэй жыцьцё. Я аб гэтым тлумачу адзінаасобніцам".

А вось што гавора калгасьніца з „Новага Міру": „Калі муж запісаўся у калгас, дык я яму гаварыла, каб ён і дамоў ня прыходзіў, не хацела нават яму есьці даваць.

Я, ды іншыя жанчыны думалі, што калгас—гэта турма. А цяпер, калі я год пражыла ў калгасе, я сьмела магу сказаць, што ў калгасе добра можна жыць. Трэба толькі жыць дружна".

Каб узмацніць саветы, неабходна зорка сачыць за вылазкамі клясавага ворага, ня даць яму магчымасьці правесьці свае кандыдатуры ў саветы, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі паслаць у саветы рабочых, батрацтва, беднякоў і лепшых сераднякоў.

— Не забываць, што кулакі ў нас яшчэ ёсьць—так сказала дэлегатка тав. Лобачава.

Дэлегаткі заявілі, што яны ва ўсёй сваёй рабоце будуць рашуча змагацца з кулацтвам, за колектывізацыю сельскай гаспадаркі.

Г.

Як работніцы і сялянкі Беларусі ўдзельнічалі ў першай рэвалюцыі

Ахвяры Курлоўскага расстрэлу ў Менску.

Рэвалюцыю 1905-6 г. г. тав. Ленін разглядаў, як „рэпэтыцыю“ да вялікай Кастрычнікавай рэвалюцыі. У гэтыя гады, пралетарыят, кіруемы партыяй бальшавікоў, у лютых узброеных сутычках з царызмам, атрымаў неабходны баявы вопыт, які даў пралетарыяту магчымасьць у 1917 годзе ў саюзе з бядняцка серадняцкім сялянствам, на хаду завяршыць буржуазна-дэмакратычную рэвалюцыю і прыступіць да будоўлі новай сацыялістычнай грамады.

Першая рэвалюцыя пачалася ва ўсёй былой Расіі, а таксама і на Беларусі ў 1905 годзе. Але падрыхтоўка гэтай рэвалюцыі пачалася шмат раней. У гэтай падрыхтоўцы вялікая роля выпала на долю работніц. У першых сацыял-дэмакратычных гуртках работніцы Беларусі прымалі вялікі ўдзел. Першая баявая стачачная каса Беларусі была арганізавана ў 80-х гадох у горадзе Вільно панчошніцамі.

У стачачнай барацьбе работніцы не адставалі ад рабочых. Але яно і ня дзіўна. Жаночая праца пры царызьме галоўным чынам прымянялася ў самых шкодных прадпрыемствах: запалкавых, тутуновых і г. д. Аплата працы была самая мізэрная, сярэдні заробак кваліфікаванай работніцы, нягледзячы на 13—14-гадзінны працоўны дзень, дасягаў 2—2½ руб. у тыдзень. Начная жаночая праца прымянялася шырока. Ахова працы адсутнічала, нават адносна цяжарных жанчын. Фабрыканты, майстры асабліва зьдзекваліся над работніцамі, прыстаючы часта да іх з самымі гнуснымі прапановамі. На гэтай глебе ў 1899 гаду забаставалі ў м. Койданаве, Менскай губэрні работніцы запалкавай ф-кі Стронгіна, а некалькі пазьней, работніцы запалкавай ф-кі Саламонава ў Барысаве.

Пачаўшаяся ў 1904 гаду вайна значна пагоршыла эканамічнае становішча рабочых і работніц. Пасілілася беспрацоўе, а таксама дарагавізна. Масы рабочых і сялян былі супроць вайны. Хваляваньні сталі насільвацца з кожным днём. Рэвалюцыянэры забілі міністра-пагромшчыка Плевэ і дзядзьку Мікалая—палача Сяргея.

Аднак становішча працоўных не паляпшалася. Жыцьцё іх усе больш пагаршалася.

9 студзеня Піцерскія рабочыя і работніцы на чале з папом Гапонам накіраваліся да царскага палацу з пэтыцыяй, у якой былі выстаўлены запатрабаваньні амністыі палітычных заключоных, свабоды слова, друку і 8-мі гадзіннага рабочага дню і г. д. Маніфэстацыя была самая мірная. Рабочыя шлі з іконамі, з харугвямі і вялі з сабой сваіх дзяцей. У царскага палацу рабочую масу сустрэлі войскі, якія без папярэджаньня пачалі страляць і забілі каля 1500 чалавек і паранілі да 5000 чалавек.

Здарэньні 9 студзеня ўзрушылі ўсіх працоўных былой Расіі. Ленін, знаходзіўшыся ў той час у Швэйцарыі, адразу ацаніў значэньне гэтых здарэньняў як вялікі гістарычны ўрок для пралетарыяту.

У Беларусі „Крывавая нядзеля“ выклікала надзвычайнае абурэньне ўсіх працоўных, у першую чаргу гарадзкога пралетарыяту. Па ўсіх гарадох і мястэчках у студзені-лютым—1905 году пракацілася шырокая хваля ўсеагульных палітычных забастовак і дэманстрацый пад лёзунгамі „далоў самаўладзтва“, „няхай жыве дэмакратычная рэспубліка“, „за 8-мі гадзінны працоўны дзень“ і г. д. Баставалі фабрычныя рабочыя і работніцы, чыгуначнікі, рамесьнікі, хатнія работніцы, ізвозчыкі, вадавозы. Справа даходзіла да ўзброеных сутычак з войскамі і казакамі. Так, напрыклад, у м. Крынкі Гродзенскай губ., зараз-жа па атрыманьні вестак аб здарэньні 9 студзеня, адбылося паўстаньне, якое было падаўлена вайсковай сілай. Сярод арыштаваных было шмат жанчын.

У лютым—сакавіку 1905 года пачаліся сялянскія хваляваньні ў Віцебскай губ. Цэлы шэраг абшарніцкіх маёнткаў і эканомій былі разбураны сялянамі. Прыбыўшыя войскі сурова распраўляліся з паўстаўшымі. Шмат сялян былі арыштаваны сумесна з жонкамі, аднак хваляваньні ня толькі не паслаблі, але прынялі больш грозны характар і к канцу 1905 году сялянскі рух ахопліваў ужо ўсе губэрні Беларусі. У гэтым руху сялянкі адыгралі вялікую ролю, выступаючы часьцяком яго застрэльшчыкамі і кіраўнікамі пры нападзеньні на маёнткі абшарнікаў.

Між тым у гарадох, рэвалюцыйны рух узрастаў. Пад кіраўніцтвам рэвалюцыйнай часткі сацыял-дэмакратычнай партыі (бальшавікоў)—рабочая кляса і

Пецярбурскі Савет рабочых дэпутатаў у 1905 годзе. Адпраўка ў ссылку.

сяляне пасіляюць наступленьне на царскі строй, які дасягае найбольшага ўздыму ў гістарычныя дні сьнежаньскага паўстаньня ў Маскве.

У шэрагах рэвалюцыянэраў і бальшавікоў у той час было шмат жанчын, пераважна работніц. У забастоўках і дэманстрацыях яны складалі значны процант. Шмат з іх былі забіты ў дэманстрацыях, казьнены, зьнясілены і асланы ў Сібір. Некаторыя гралі кіруючую ролю ў рэвалюцыйных арганізацыях. Так у сваім сакрэтным данясеньні ад 22 сакавіка 1905 г. Віцебскае губэрнскае жандарскае кіраўніцтва паведамляе дэпартамант паліцыі, што сацыял-дэмакратка пад клічкаю „Зіна“, яна-ж „Анна Сямёнаўна“, вядзе ў Віцебску кіруючую работу „Памянёнаю Зінаю—чытаем мы ў гэтым данясеньні,—складзены ўсе праклямацыі, распаўсюджваемыя ў апошні час ў Віцебску ад імя РСДРП.“

У Менску значны ўдзел у рабоце бальшавіцкай арганізацыі прыймала Міхайлава-Белецкая і шэраг іншых.

Мы ня станем пералічваць прозьвішча работніц і сялянак, якія ўдзельнічалі ў рэвалюцыі 1905 года, гэта справа гісторыка, які падрабязна апіша здарэньні першай рэвалюцыі ў Беларусі. Нам досыць пакуль толькі адзначыць, што ў першым штурме цьвярдыні старога самаўладнага строю, работніцы і сялянкі Беларусі прынялі самы актыўны ўдзел, што ў годы першай рэвалюцыі, працоўныя жанчыны

Удзельніцы ўзброенага паўстаньня на Чырвонай Прэсьні: злева—направа 1) Воскрэсенская, 2) Кукслева 3) Лыгвіна.

гераічна, самаатвержана бароліся за новае сьветлае свабоднае жыцьцё і што гэтай сваёй барацьбой яны садзейнічалі падрыхтоўцы перамогі Вялікай Кастрычнікавай Рэвалюцыі.

Л. М.

*) Поп Гапон аказаўся правакатарам быў пазьней казьнен рабочымі.

Узброенае паўстаньне ў Маскве ў 1905 годзе. На здымку: Барыкады на Прэсьні.

Пасьля рэвалюцыі 1905 году. На здымку: Катаржанка, закаваная ў ручныя і нажныя кайданы.

Праз барыкадныя бойкі 1905 году, праз перамогу ў Кастрычніку 1917 года, праз суровую грамадзянскую вайну—рабочая кляса, у саюзе з працоўным сялянствам, пад выпробаваным кіраўніцтвам Ленінскай партыі дабілася вялізарнейшых посьпехаў у галіне індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, пераможна ўступіла ў пэрыад сацыялізму.

Работніцы, калгасьніцы, батрачкі, бяднячкі, сераднячкі, працоўныя жанчыны! Мацней згуртуем свае шэрагі вакол Бальшавіцкай Партыі і яе Ленінскага ЦК.

Яшчэ шырэй разгорнем сацыялістычнае наступленьне! За пяцігодку ў чатыры гады! За ліквідацыю кулацтва як клясу на аснове суцэльнай калектывізацыі! За ўмацненьне абароназдольнасьці Савецкага Саюзу!

Узмацнім барацьбу супроць правых і „левых“ апартуністых—агентаў клясавага ворага!

Каму патрэбны „каляды“

Каляды сьвяткаваліся нашымі продкамі многа тысяч гадоў таму назад, яшчэ задоўга да паяўленьня хрысьціянства. Гэтае сьвята ўтваралася нашымі продкамі ў гонар сонца, якое яны лічылі богам. Ім здавалася, што сонечны бог зімою памірае. І вось, калі яны замячалі, што ў канцы сьнежня дні пачынаюць павялічвацца, яны лічылі, што ў гэты год нарадзіўся сонечны бог. Сьвята ў гонар нараджэньня гэтага сонечнага бога яны назвалі „каляды“.

Каля тысячы гадоў таму назад, сярод нашых продкаў стала распаўсюджвацца хрысьціянства. Духоўнікі перанесьлі да нас хрысьціянскае сьвята „рожэство“. Яны распаўсюджвалі сярод веруючых казкі аб тым, што ад дзевы Марыі нарадзіўся „младзенец“, які быў ня простым чалавекам, а боскім сынам. Нарадзіўся ён быццам дзеля таго, каб пазбавіць людзей ад цяжкага жыцьця. Аб гэтым кажуць веруючым папы, ксяндзы і сэктанцкія прапаведнікі. Яны абяцаюць веруючым нябеснае царства, калі гэтыя веруючыя будуць выконваць тое, чаму быццам навучаў боскі адпакутнік хрыстос. Ніколі не нараджаўшамуся хрысту духоўнікі прыпісваюць яго вучэньне: „усе людзі браты“, „неабходна любіць ворагаў“, „хто будзе біць цябе па аднэй шчацэ, падстаў яму другую“.

Цяпер паглядзім, каму карысна калядная пропаведзь. Духоўнікі заклікаюць да міра ўсіх людзей да якой-бы клясы яны не належалі, заклікаюць да міру бедняка з кулаком, рабочага з капіталістым. Такая пропаведзь зьяўляецца надзвычайна шкоднай для працоўных. Яна ўстрымлівае іх ад клясавай барацьбы.

У сучасны момант у нас адбываецца вялікая перабудова ўсяе гаспадаркі СССР на сацыялістычных пачатках. Ці-ж можна такую перабудову правесьці мірным шляхам без барацьбы з клясавымі ворагамі? Бязумоўна, без барацьбы ў гэтай справе абыйсьціся нельга. Калектывізацыя бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак выклікае шалёнае супраціўленьне кулацтва. Кулакі змагаюцца з калгасным рухам, падпальваюць калгасныя будынкі, забіваюць калгасных працаўнікоў, псуюць калгасныя машыны. Запаведзь аб любві да ўсіх людзей, перш за ўсё забываецца самімі „багамольнымі“ людзьмі на сяле—кулакамі. У барацьбе супроць калгасаў кулакам дапамагаюць папы, ксяндзы, і сэктанты. Яны распаўсюджваюць пра калгасы розныя чуткі, палохаюць беднякоў набліжаючымся „страшным судом“.

Прапаведуючы мір на словах, а на справе абвяшчаючы, вайну калгасам, кулакі, папы, ксяндзы і сэктанты хочуць, каб беднота, батрацтва і сераднякі паслухалі іх, адмовіліся ад арганізацыі калгасаў і зьнішчэньня кулацтва як клясы, зрабіліся кроткімі і сьмірэннымі авечкамі.

Такім чынам легенда аб нараджэньні боскага пакутніка шкодзіць індустрыялізацыі нашае краіны і сацыялістычнай перабудове вёскі, бо надзея на боскага пакутніка ўстрымлівае веруючых ад удзелу ў сацыялістычным будаўніцтве і дапамагае кулацтву змагацца з ажыцьцяўленьнем пяцігадовага пляну.

Трэба заўважыць, што самі папы, ксяндзы, сэктанцкія прапаведнікі ў барацьбе з сацыялістычным будаўніцтвам не спадзяюцца на дапамогу хрыста, а разьлічваюць больш за ўсё на дапамогу замежнай буржуазіі, якая рыхтуе вайну супроць нашай пралетарскай рэспублікі,—на дапамогу замежных царкоўнікаў на чале з папай рымскім, на кулацкі абрэз і стрэл з-за кута.

Розныя рэлігійныя арганізацыі нярэдка займаюцца шпіянажам і за золата перадаюць капіталістычным дзяржавам зьвесткі аб колькасьці Чырвонай арміі, яе ўзбраеньні. Так, у 1928 годзе на Украіне была раскрыта шпіёнская арганізацыя з баптыцкіх прапаведнікаў. На чале гэтай арганізацыі стаяў нейкі Шаўчук, контрабандысты, шпіён. Ён працаваў па заданьням польскага генэральнага штабу. Такая-ж арганізацыя некалькі гадоў была раскрыта і ў Менску.

Дзе-ж тут „мір хрыстовы“, аб якім кажуць у час каляд папы, ксяндзы і сэктанты? Міру ніякага няма і ня можа быць, покуль існуе клясавая барацьба, пакуль ня будзе канчаткова зьнішчана кулацтва, як кляса, пакуль ня будзе сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі.

У сувязі з перажываемымі зараз часовымі труднасьцямі ў снабжэньні насельніцтва прадметамі першай неабходнасьці, папы, ксяндзы і сэктанты ўзмацняюць сваю агітацыю, у асаблівасьці сярод жанчын. Пагэтаму неабходна правесьці сярод працоўных жанчын растлумачальную работу аб сапраўдных прычынах нашых гаспадарчых труднасьцяй. Неабходна таксама вылучыць жанчын-бязбожніц у каапэратывы для кантролю за правільным разьмеркаваньнем прадуктаў.

Антыкалядная кампанія саўпадае з перавыбарамі саветаў. Неабходна зьвярнуць увагу на разаблачэньне шкоднай дзейнасьці папоўскіх, ксяндзоўскіх, сэктанцкіх, равінскіх і іншых рэлігійных арганізацый, якія імкнуцца агітаваць за свае кандыдатуры і робяць спробы сарваць перавыбарчыя сходы.

Каляды і другія рэлігійныя сьвяты звычайна суправаджаюцца п'янствам і хуліганствам. П'юць і папы, абыходзячы дамы веруючых. Дарослыя прывучаюць піць гарэлку малых дзяцей. Усё гэта прыносіць вялізарную шкоду здароўю, акрамя таго, на гарэлку трацяцца вялікія сродкі, шмат хлеба пераводзіцца на самагон. П'янства нясе вялікія страты для вытворчасьці, таму неабходна дабіцца, каб у дні каляд, усе рабочыя, калгасьнікі, саўгасьнікі і служачыя выходзілі на працу. Трэба, каб у гэтыя дні яшчэ больш пашыралася сьвядомасьць, што рэлігія сапраўды замацоўвае старыя рабскія адносіны да працы, стары эксплёататарскі быт. У дні каляд неабходна разгарнуць энэргічную агітацыю за калгаснае будаўніцтва, за пераход на шматпольле, за рацыянальную жывёлагадоўлю і інш.

Антыкалядная кампанія павінна зрабіць зрух для разгортваньня сыстэматычнай бязбожнай работы сярод працоўных і ў асаблівасьці сярод жанчын. Рэлігійныя арганізацыі найбольш усяго абапіраюцца на жанчыну, карыстаючыся яе несьвядомасьцю і неразуменьнем клясавай шкоднасьці рэлігіі. Таму ў час антыкаляднай кампаніі неабходна асаблівую ўвагу зьвярнуць на ўцягненьне ў ячэйкі „ваяўнічых бязбожнікаў" жанчын. Не павінна быць ніводнага прадпрыемства, калгаса і саўгаса, у якім-бы ня было ячэйкі ваяўнічых бязбожнікаў. Трэба памятаць словы таварыша Леніна, які гаварыў, што „ўсе рэлігіі і рэлігійныя арганізацыі зьяўляюцца ні чым іншым, як сродкам буржуазнай рэакцыі".

Настаўнік праводзіць антырэлігійную гутарку ў школе.

Доўгаполаў.

Культ-эстафэта ў дашкольных установах

(На вечары трох дзіцячых садоў)

У гадавіну дашкольнага паходу трэба адзначыць значнае дасягненьне ў галіне пашырэньня сеці дашкольных устаноў і паляпшэньня якасьці работы маючыхся ўстаноў. Але ёсьць яшчэ шмат недахопаў, якія трэба зьнішчыць у далейшым.

Вось на гэтых недахопах і застанавілі сваю ўвагу бацькі трох дзіцячых устаноў (3, 10, 14 дзіцячыя сады) на інтэрнацыянальным вечары, прысьвечаным гадавіне дашкольнага паходу і Культ-эстафэце.

На гэтым вечары-сходзе было адзначана, што рост прамысловасьці, уцягваньне ў вытворчасьць вялікай колькасьці жанчын ідзе хуткім тэмпам, у той час як пабудова дзіцячых устаноў (ясьляй, дзіцячых садоў) яшчэ адстае.



Яўрэйскі дзіцячы сад у Менску.

Дзіцячыя сады ня могуць яшчэ поўнасьцю задаволіць матку-работніцу, якая працуе ў дзьве зьмены, яна павінна альбо пакінуць дзіця аднаго, альбо трымаць другога чалавека для абслугоўваньня дзіцяці ў адсутнасьці маткі. Як у першым, так і ў другім выпадку гэта не вырашае пытаньня аб поўным аслабаненьні работніцы.

Другія недахопы, арганізацыйнага характару; харчаваньне дзяцей у садох залежыць ад сродкаў бацькоў і таму, калі бацькі больш зарабляюць, дзіцячы сад можа лепш карміць сваіх дзяцей і наадварот. Гэта не дае магчымасьці правідлова вырашыць пытаньне харчаваньня садоў. З ФУБР'у мала сродак адпускаецца дашкольным установам. Тут павінен быць строгі кантроль з боку работніц, каб дашкольныя ўстановы атрымлівалі належны процант для палепшаньня становішча дзіцячых садоў.

Не прайшлі і міма выхаваньня. Бацькі актыўна выступілі на сходзе з патрабаваньнем клясавага выхаваньня дзяцей. У той момант, калі клясавы вораг выступае з шэрагам шавінісцкіх групіровак у працы дзіцячых садоў трэба даваць рашучы адпор усякага роду нац.-дэмократычнага ўплыву. Наша выхаваньне павінна быць нацыянальным па форме і пралетарскім па зьместу.

Міндліна.

ЖЫВАЯ НЯБОЖЧЫЦА



Апавяданьне Юркі Лявоннага

У час абедні ля крыласу Прахарэнка айцу Пафнуту мігнуў:

— У дальняй пячоры, за сялом... Як кароў прыганяць...

— Благаславен бог наш!.. Прыду абавязкова... Ныне і прысна... Захапі палавінку, Адам Пятровіч... Ва векі вякоў.

Вапенны завод—на краі Ліцьвінавіч. Не завод—проста капальні, злучаныя шырокімі раўчакамі, у якіх апальваюць вапнай.

Над белымі капальнямі з вечару гусьцее змрок. Ад блізкае рэчкі дыхае на яміны туман,—тады завод стаіць, як здань, заклiканая пільнаваць спакой сяла.

Ужо два гады капальні пустуюць. Вышаў запас вапны— і цяпер толькі сялянская дзятва іншы раз робіць экскурсіі на дно пячор.

У жылістых адамавых руках паўлітроўка здаецца аптэкарскай бутэлячкай з нейкай празрыстай мікстурай. Адам паціху адкавырвае сургуч і няўлоўным рухам правай рукі высаджвае корак.

— Піце, бацюшка, вы спачатку... Я ўжо зраньня крышку ўзяў.

Заросшы ўвесь Адам. Чорны, даўжэзны. І голас—як у пустую бочку:

— Бу-бу-бу.

— Уявеце... Як ёсьць усё выграблі... Нават адзін атос і зусім новую хамуціну.

— Ходзяць чуткі, што самі нібыццам прызнаюцца; ня правільна раскулачылі цябе, Адам Пятровіч,—няўпэўнена ўстаўляе поп Пафнут,—паколькі ў выбарчых правох не пакрыўджаны і толькі ў заможных сераднякох лічышся... І маемасьць, кажуць, зьвярнулі... Хэ-хэ-хэ.

— Якое там зьвярнулі, ліха іхнай матары. Добра, што я ім пылу ў вочы пусьціў. Кажу, хварэю ўвесь час—ну і працуе калі-ні-калі батрачок... Бадай на іх звод. Ну што-ж, пытаюцца, значыць, вашая гаспадарка—не запушчаная, ладная? Ды кажу нішто—працуем ладна. А хамуціна так і залілася... Капеек дзевяноста каштавала. Эх!

Плюнуў з дасады Адам. На белі сьцяны пляма з сподак распаўзлася.

Айцец Пафнут зьзіраецца на яго, спачувае і зайздросьціць. Кончык ільняное барады ў рот засунуў. Бегае вачыма па магутнай адамавай постаці.

— Але... давайце быка за рогі. Ад калгасьнікаў сталым людзям жыцьця няма... Сенажаць ім дай—зноў-жа абрэзка... Прыцясьненьне, можна сказаць, вялікае церпім.

— Дарма і казаць. Усё бязбожнікі... Ад такое парафіі—два дні да сьмерці...

— Вось і надумаўся я праз Машку Лаўрыніхіну ўзьдзейнічаць... Праз дуркаватую, значыць... З тэй пары, як на цьвінтары бацькоў яе закатавалі зялёнаўцы, ды самую на паперці згвалцілі — яна ўсё ля царквы швэндае... Вас яна павінна паслухаць... А вы, бацюшка, ёй і скажыце... Хто гэта? Гляньце-ка ў гару!..

Высунуў скуфейку айцец Пафнут:

— На канюшню павялі хлопцы... За Гуцукі.

— Цішэй трэба...

Расплыліся ў пацёмках галасы. Патухлі. Папоўскі — ценекькі, фальцэтны, і прахарэнкаў—медны і глухі:

— Бу-бу-бу!

Пачалося ад машкавай халупы. Рукой падаць ад яе да калгаснае пуні. Дах на пуні—саламяны, гніль ды суш. І вецер туды...

Загуло, зашугала зарыва. Крывавымі воблескамі асьвяцілася далячынь. У ноч, у мітусьніну і адчай, урываліся ўскрыкі, сьлёзы і енкі.

На ўскраіне сяла ўспыхнуў дзіцячы лямант:—Ай-яй-яй!.. Мату-уулечка! Куды-ж ты?.. Мату-у!..

Віхуры несьлі разам з хмарамі пылу палаючую салому, галавешкі і попел.

— Грамадзя-яне! За вёдры!.. Цягні багром левае. Андрошкін, уніз!..

— Давайце яшчэ адну. Брансбой угару! Та-ак!..

Праз чвэрць гадзіны на дапамогу падасьпела другая пажарная дружына—з русакоў.

Яшчэ лізалі неба тонкія чырвоныя языкі полымя, яшчэ стаяў на вуліцы жар і тупат, а ў супроцьлеглым баку Ліцьвінавіч Адам Пятровіч Прахарэнка дрыжачаю рукою ўжо запальваў лямпадку ля абразу Міколы цудатворцы і ксьціўся на дрэўні ківот.

— Дзякуй божа, хоць і ня зусім зьнішчаны калгасьнікі, але бяз жывёлы і пасеўнага збожжа, ня хутка на ногі ўстануць...

А супроць дому, абкладзенага ў індывідуальным парадку, грамадзяніна Прахарэнкавага ў цесным і брудным пакоі, пад паветкай пялёнак і жончынай сваркі, магістар багаслоўя, калішні пратаерэй Пафнут Ліхабрашчанскі лічыў замусоленыя жоўтыя крэдыткі.

Далічыўшы да дзесятку, ён задаволена ўздыхнуў, правёў рукою па ледзь кранутых сівізнаю валасох і праказаў у кут:

— Матушка! Даволі скрыпець .. Чырвончык, дзякаваць Адаму Пятровічу, ёсьць—і маўчы... Хэ-хэ-хэ! Колькі чалавеку трэба?

На заўтра бабы пачалі знасіць да Адамавае жонкі хустачкі, шматкі крамніны, стужкі.

— Паклапоцімся аб нябожчыцы, бабачкі, — казала сама Аўгіня Прахарэнкава,—а ні чогачка-ж у яе няма, каб костачкі грэшныя прыкрыць. Што гаварыць, ад уласнага злачынства загінула,—але пашкадаваць трэба... І самагоншчыцкая душачка ў рай хоча!

— Самагоншчыцкая, суседачка? Няўжо яна...

— А як-жа? Дурная - дурная, а вось зарабіць захацелася. І апарата згарэла і ад самое толькі косткі паленыя засталіся... Праз яе і пажар на ўсё сяло выбухнуў... Ды цяперацька няма каму пакла-

паціцца аб ёй. На сябе ўжо абавязак узяла перад богам.

У маленькай труне нельга было разгледзець рэшткаў вар'яткі Машкі. Паркалёвыя тканіны ды некалькі дробных мэталёвых рэчаў—персьцянкі, крыжыкі — займалі ўсё мейсца.

А пятай гадзіне з двара Прахарэнкавых панясьлі яе на кладзішча.

Айцец Пафнут ішоў наперадзе. Ён быў „пад мухаю", але імкнуўся ісьці цьвёрда. У высокія ноты свайго голасу ён уплятаў мінор і ўрачыстасьць.

— Са сьвяты-ымі... Упакой-оой!.

Тэмпы пяяньня нагадвалі кавалярыйскі марш.

Натоўпу ня было. Чырванелася толькі некалькі жаночых хусьцінак.

А Машка Лаўрыніхіна, нарэшце аб'явілася. Вучастковы міліцыянэр Назарык тыдні праз два, ідучы ў Ліцьвінаўскі сельсавет, напаткаў яе ля варот Цьвінтару. Ажно зьбляднеў небарака ад жаху, паджылкі закалаціліся:—Машка!.. Цьфу—цьфу. Машка... Лаўр... Ды, што за чорт? Адкуль ты?

На закаце было. Даўжэлі цені. І дзяўчына перад ім стаяла—абадраная, дзікая і самотная.

— У раённай міліцыі гэты-ж Назарык даваў потым „экскурсантам" тлумачэньні.

— Быў я пры выкананьні службовых абавязкаў. Так. Ну, дзяўчына хворая, як належыць. Насупроць. Дапрасілі. Так. Гаворыць мала. Толькі дамагліся, што бегла ад пажару тады вёрстаў дваццаць. Як належыць. Пра тое скаМіліцыянэру прышлося вывесьці на ганак падпальшчыцу, паказаць яе ўсім.

— Людцы добрыя, Машка, далі-бог Машка! Адгукніся!

— Ма-а-шачка! Ці памятаеш ты старую Домну Лакізаву? Гляць сюды.

За будынкам на стайні, сярод



Натоўпу ня было.

зала, як ёй поп Ліхабрашчанскі абяцаў ад імя Прахарэнкавых новую хату ў другой акрузе паставіць. Ну, мы і бацюшку з кулачком да справы прышылі. Як належыць. Абодвы сядзяць. Чаму зьвярнулася? Ну, першае, што ў лясох надакучыла спацыраваць, а далей,—да царквы, кажа, прыхіл маю... Так, ня вытрывала.

Бабы Ліцьвінаўскія валам паваліліў раён. Цуда ўзьнікла! Адпеты закапаны чалавек уваскрос! Загалдзелі перад дзьвярыма, зашумелі. іншых рэчаў доказу, прымасьціўся завінуты клумак—труна з „нябожчыцай", адкапаная па загаду Нарсьледчага. У ёй аказалася па праверцы груда матэрыі, жменька залы ды два сьвінных пазванкі. Чалавечых касьцей ня было.

І на версе гэтае старанна акленае каляровай паперай скрынкі айцом Пафнутам пакладзеная ляжала стужка з царкоўна-славянскай вязьзю:

— Сьвяты божа, сьвяты крэпкі, сьвяты бясьсьмертны, памілуй нас.

Ліквідацыяй няпісьменнасьці б'ем па рэлігійнаму дурману

Працуем і вучымся

У калгасе „Чырвоны сьцяг", Брынеўскага сельсавету, адчыніліся сталыя яські, якія ўжо працуюць семь месяцаў. Загадчыца яськаў тав. Галіноўская праводзіць з намі сходы. Яна нядаўна на агульным сходзе калгасьнікаў, завербавала на пазыку „Пяцігодка ў чатыры гады" калгасьнікаў і служачых сельсавета на 110 рублёў і сама першая ўзяла аблігацыю на 10 рублёў. Цяпер мы, скончыўшы нашу працу, вядзем дзяцей у яські, а самі ходзім вучыцца.

У яськях нашым дзецям і чыста і сьветла. З дзецьмі праводзіцца выхаваўчая работа, яны ведаюць ужо, хто правадыр нашай рэвалюцыі, хто быў Ленін.

У яськях дзяцей вылечылі ад залатухі і ўсякіх іншых хвароб. Яські аслабанілі матак для працы. Мы заклікаем усіх бяднячак і сераднячак ісьці ў калгас і тады вы будзеце шчасьлівыя, як і мы.

Аня Невіркевіч".

Адчыніўся лікбез

Пры школе калгасу імя „Дзесяцігодзьдзе БССР" Магілеўскага раёну адчыніўся лікбез, які наведваюць акуратна і займаюцца старанна 15 дзяўчын і некалькі хлопцаў. У калгасе яшчэ ёсьць некалькі няпісьменных і малапісьменных, якім таксама патрэбна запісацца ў лікпункт, бо толькі з навукай мы здолеем палепшыць наша жыцьцё.

Новасельскісельсавет. **Г. М.**

Часопісь у дапамогу няпісьменным

У вёсцы Дварэц калгасьніцы і адзінаасобніцы пасьля дакладу аб месячніку „Часопісь Беларуская работніца і Сялянка ў масы" вылучылі 3-х упаўнаважаных па падпісцы і прызналі неабходным у гуртку лікбеза, якія наведваюць 50 жанчын, увесьці чытку і разбор матар'ялу часопісі.

Чашніцкі раён. **Ф-а.**

Трэба ліквідаваць няпісьменнасьць

У нашым Белічанскім сельсавеце ёсьць шмат няпісьменных, але справа на вёсцы з ліквідацыяй няпісьменнасьці абстаіць дрэнна, асабліва сярод жанчын. Партыйная і камсамольская ячэйкі, а таксама сельсавет і хата-чытальня работы па зьнішчэньню няпісьменнасьці ніякай не вядуць. Пачаўся новы навучальны год, трэба зараз-жа распачаць працу сярод калгасьніц і наогул сярод насельніцтва, каб у 1931 годзе ліквідаваць няпісьменнасьць.

Шэрман Л.

—— Падпісвайцеся на ——
„Беларускую Работніцу і Сялянку" на 1931 год.

Не павярнуліся тварам да вытворчасьці

Фабрыка „Восьмага сакавіка“ рыхтуе кадры для швэйнай фабрыкі „Кастрычнік“. У мінулым годзе яна падрыхтавала 300 кваліфікаваных работніц. Цяпер, у сувязі з недахопам рабочае сілы, на наступны год гэтыя лічбы павялічаны: з студзеня да кастрычніка 1931 году фабрыка павінна падрыхтаваць новых 500 работніц.

Задача гэта вельмі адказная, бо, акрамя навучэньня кваліфікацыі, фабрыка „Восьмага сакавіка“ павінна перавыхоўваць гэтых работніц у клясава сьвядомых, каб у іх сапраўды былі адносіны да вытворчасьці, як да сацыялістычнай. Гэта першачарговая задача важна таму, што культурна-палітычны ўзровень работніц, іх пралетарская сьвядомасьць зусім нізкі. Гэта—людзі, якія нядаўна прышлі з вёскі і дагэтуль ня бачылі варштату, альбо жонкі рабочых, якія ніколі не працавалі ў вытворчасьці.

Нажаль, фабрыка „Восьмага Сакавіка“ з важнай задачай—выхаваньнем работніц ня справілася. Мінулае парткіраўніцтва фабрыкі было вельмі слабае, яно не вяло тую вялізарную партыйна-выхаваўчую працу, якую трэба весьці ў сучасны момант у вытворчасьці, яно не павярнулася тварам да вытворчасьці.

Адозва ЦК УсеКП(б), якая па ўсёй краіне Саветаў узьняла вялікую актыўнасьць, нават адсталых пластоў працоўных, гэтая адозва ЦК ня была прапрацована сярод работніц фабрыкі „Восьмага Сакавіка“. Вытворчыя нарады толькі нядаўна пачалі працаваць.

Таму ня дзіўна, што да сёнешняга дню маецца яшчэ значная колькасьць работніц, якая нядобрасумленна адносіцца да вытворчасьці, якая псуе матар‘ялы і зусім не зацікаўлена ў узьняцьці вытворчасьці працы.

Напрыклад, работніца **Чарэпка** гаворыць, што ёй хапае на жыцьцё 30 капеек у дзень, а таму больш як на 30 капеек яна працаваць ня хоча. Можна сабе лёгка ўявіць, якую яна выпускае прадукцыю пры гэткіх адносінах. Чарэпка заўсёды адносіцца дрэнна да працы, заўсёды ў яе кішэні прышыты не на месцы, яна робіць брак. Недалёка ад Чарэпкі адышла і **Швэц**. Яна часта робіць прагулы, лянуецца працаваць і дае ня толькі малую колькасьць прадукцыі, але і дрэнную якасьць.

Такіх як Чарэпка і Швэц шмат. Праўда, да некаторых былі прыняты захады выхаваньня — грамадзкія суды. Гэта мела ўплыў на тых работніц, якія жадаюць працаваць, на якіх узьдзейнічае пралетарская крытыка. Гэтакіх можна перавыхоўваць. Горш з такімі работніцамі, якія ня лічацца з указаньнем майстраў і фабрычных арганізацый. Былі выпадкі, калі майстар рабіў заўвагу работніцы за дрэнную працу, яна зараз-жа заявіла:



Ільняны камбінат у Воршы. На здымку: фарбовачна-аплітурны цэх.

— Дайце разьлік, я лепш працаваць не магу.

Зразумела, што гэткае разважаньне не пралетарскае; яно даказвае, што ў гэтай работніцы няма зацікаўленасьці навучыцца добра працаваць, дапамагчы дзяржаве выпускаць добрую прадукцыю, каб забясьпечыць працоўных добрай вопраткай.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што партыйнай ячэйцы фабрыкі „Восьмага Сакавіка“ трэба пачаць глыбокую працу па клясаваму выхаваньню тых кадраў, якія ідуць у вытворчасьць. Цяпер парткіраўніцтва адноўлена. Пачынае працаваць дэлегацкі сход. Ён павінен быць той апорай, пры дапамозе якой трэба весьці культурна-выхаваўчую працу ў цэху; прапрацоўваючы на дэлегацкіх сходах вытворчыя пытаньні, трэба ўцягваць дэлегатак, а за імі ўсіх работніц у актыўную вытворчую працу.

Побач з агіднымі зьявішчамі дрэнных адносін паасобных работніц да вытворчасьці, ёсьць работніцы, якія сапраўды добра і сьвядома адносяцца да працы. Вось тыя з лепшых работніц: т. т. Жарова, Бацьвінік, Шпілеўская і Барткевіч; яны лепшыя ўдарніцы па колькасьці і якасьці выпускаемай прадукцыі.

Камсамольская ячэйка таксама арганізавала дзьве ўдарныя брыгады імя „9-га Зьезду камсамолу“.

Слабае разгортваньне сацспаборніцтва, зусім слабая работа па вытворчаму выхаваньню работніц прывялі да таго, што за два месяцы ўдарнага кварталу кастрычнік—лістапад, фабрыка „Восьмага Сакавіка“ недавыканала вытворчае заданьне на 14 процантаў. Гэтаму прарыву спрыяла і тое, што Белшвэйаб‘яднаньне, якое кіруе фабрыкай, некалькі разоў мяняла пляны і асортымэнт прадукцыі (раней працавалі дамскае паліто, потым перайшлі на працу дзіцячай вопраткі).

Па заданьню Белшвэйаб‘яднаньня намячалася выпусьціць за 18 дзён сьнежня 30 тысяч дзіцячае паліто. Пасьля прапрацоўкі заданьня на бюро парт‘ячэйкі і сходзе рабочых прынята было толькі 18 тысяч паліто. Цікава тое, што на сходзе прадстаўнік Белшвэйаб‘яднаньня нават не абараніў свой плян, мусіць ён, пераканаўся ў нерэальнасьці яго.

Але-ж на гэтым яшчэ не канец. Галавацяпскае кіраўніцтва „Белшвэйаб‘яднаньня“ тармазіць падрыхтоўку фабрыкі да трэцяга году пяцігодкі. Ужо некалькі раз мяняюцца пляны. Першае заданьне было яшчэ ў лістападзе. Яно было добра прапрацавана сярод рабочых і работніц, якія высунулі свой сустрэчны прамфінплян. Здавалася-б, што ўсё добра. Але праз месяц пачалі складаць другія пляны.

У выніку да 20-га сьнежня фабрыка яшчэ ня мае вытворчага заданьня. На парозе трэцяга году пяцігодкі апартуністыя з „Белшвэйаб‘яднаньня“ яшчэ сядзяць па габінэтам і складаюць пляны, а фабрыка засталася дагэтуль бяз пляну і бяз сустрэчнага.

Гэтай справай павінны заняцца партыйныя органы. Трэба моцна ўдарыць па апартуністым з „Белшвэйаб‘яднаньня“ і навучыць іх працаваць па-бальшавіцку.

А. Зоркая.

Праз вытворчыя нарады будзем выхоўваць клясава-сьвядомыя кадры для вытворчасьці.

Дэлегацкія сходы дапамагаюць сацыялістычнаму будаўніцтву

Актыўнасьць дэлегатак расьце

(*Пятрыкоўскі раён*)

Выкрытыя вылазкі клясавых ворагаў—„Прампартыі“, контррэволюцыйнай групы беларускіх нац.-дэмакратаў, значна ўзьнялі актыўнасьць работніц, батрачак і калгасьніц.

У адказ шкоднікам і контррэволюцыянэрам, дэлегацкі сход пры каапэратыўнай ячэйцы падпісаўся на пазыку „Пяцігодка ў чатыры гады“ на 50 рублёў, і вядзе далейшае распаўсюджваньне пазыкі. На гэтым-жа сходзе Рудзько Насьця, Бычкоўская Алена і іншыя дэлегаткі абвясьцілі сябе ўдарніцамі.

Дэлегаткі калгасу „Чырвонае Палесьсе“ таксама абвясьцілі сябе ўдарніцамі па працы ў калгасе і па вярбоўцы новых калгасьнікаў.

Дэлегаткі ў ліку 23 чалавек уступілі ў Асоавіахім, адлічылі аднадзенны заробак у карысьць абароны і падпісаліся на пазыку па 5 рублёў кожная.

Калгасьніцы-дэлегаткі Брынеўскай ячэйкі падпісаліся на дэлегацкім сходзе на 25 рублёў на пазыку і даручылі двум дэлегаткам далей весьці распаўсюджваньне пазыкі.



Дом менскай біржы працы для прыежджых жанчын.

У вёсцы Аголічах дэлегаткі правялі суботнік у дапамогу заводу „Чырвоная Зьвязда“ па ліквідацыі прарываў у сувязі з правядзеньнем на заводзе вытворчых манэўраў.

Дэлегаткі Гарбаўскай ячэйкі падпісаліся на пазыку калектыўна на 25 рублёў і вядуць далейшую падпіску.

Мы заклікаем астатнія дэлегацкія сходы нашага раёну браць прыклад з гэтых дэлегацкіх сходаў, а таксама практычна дапамагаць парт'ячэйкам у правядзеньні іншых гаспадарча-палітычных кампаній (арганізацыя чырвоных абозаў па бульбе, ільну, удзел у правядзеньні калектывізацыі), асьвятляючы на старонках часопісі свае дасягненьні і недахопы.

Андрэйчык.

Ячэйка ня кіруе дэлегаткамі

За апошнія дзесяць дзён ліставаду арганізавалася 12 новых калгасаў у Нарэйкоўскім сельсавеце Койданаўскага раёну.

Дэлегаткі нічога ня робяць па дапамозе калектывізацыі, таму што дэлегацкі сход зусім не працуе. Ужо здаецца каля двух месяцаў прайшло пасьля перавыбараў новага складу дэлегатак, але работы зусім ніякай не вядзецца.

Ёсьць актыўныя дэлегаткі, якія жадаюць і могуць быць актыўнымі ва ўсіх праводзімых партыяй і ўрадам кампаніях, але няма кіраўніцтва працай дэлегатак.

У складзе месцачковага савету было 19 жанчын, з якіх актыўна работала толькі 5.

У перавыбарчую кампанію саветаў падрыхтоўчай работы сярод жанчын не вядзецца.

Па сваёй ініцыятыве мы арганізавалі брыгады па збору уцілю, і сабралі шмат жалезнага і чугуннага лому.

Калі-ж ячэйка пачне кіраваць нашым дэлегацкім сходам?

Дэлегатка А.

Дэлегаткі дапамагаюць паянакапленьню

Пры клюбе камунальнікаў адбыўся сход дэлегатак ЖАКТ'аў „Фрунзэ“ і „Чырвоны Кастрычнік“, дзе разглядалася пытаньне аб паянакапленьні. Дэлегаткі ўзялі на сябе абавязак павесьці шырокую растлумачальную працу сярод насельніцтва аб задачах узмацненьня жыльлёвай каапэрацыі. Сход прыняў пастанову аб уступленьні пайнікамі жыльлёвай каапэрацыі ўсіх дэлегатак вышэйпаказаных жактаў.

Другі дэлегацкі пункт пры Жакце „Заравец“ выклікаецца пасьледваць прыкладу дэлегацкага сходу жактаў „Фрунзэ“ і „Чырвоны Кастрычнік“.

Г. М.

Магілеў.

Дэлегатка Ілюцька Мальвіна—лепшая ўдарніца

Дэлегацкія сходы выхоўваюць стойкіх, клясава-вытрыманых барацьбітоў за новае жыцьцё. Аб гэтым можа сьведчыць прыклад калгасьніцы Ілюцькі Мальвіны, якая некалькі год была дэлегаткай. Зараз яна першая як у грамадзкай працы, так і ў вытворчай. У калгасе яе накіроўваюць на самую цяжкую і адказную працу. У сучасны момант ёй даручан дагляд за жывёлай і з гэтай справай яна спраўляецца вельмі добра. Яна першая запісалася ва ўдарную брыгаду і паказала прыклад сапраўдна ўдарнай работы.

Калгасьнікі яе працу ацанілі і прэміравалі як лепшую работніцу.

Калгас „Зьвязда“, Сьмілавіцкі р. **Дэлегатка.**

Абмяжоўваліся выбарамі

У Асінаўскім сельсавеце партыйная ячэйка зусім ня цікавіцца працай сярод жанчын, абмежаваўшыся толькі выбарамі дэлегатак. Часопісь „Беларуская работніца і сялянка“ ня выпісваецца.

Расьнянскі р. **Захарэнка Куліна.**

Прыступілі да працы

Дэлегаткі мястэчка Койданава пасьля перавыбараў зараз-жа прыступілі да працы. Арганізавалі лікпункт; прыступілі да збору ўцільсыравіны. У „дэкаду абароны“ дэлегаткі пастанавілі ўсе ўступіць у гурток першай дапамогі. Дэлегаткі таксама распаўсюджваюць нашу часопісь „Беларуская Работніца і Сялянка“ сярод жанчын. Дэлегаткі абвясьцілі сябе ўдарніцамі грамадзкай працы.

Дэлегатка Калачык Р.

Ударнай працай замацуем калгас

У вёсцы Дварэц, што знаходзіцца за 12 вёрст ад раённага цэнтру, арганізаваўся ў мінулым годзе калгас. Большасць бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак гэтай вёскі і двух суседніх уступілі ў калгас. Але кепскае кіраўніцтва мясцовых працаўнікоў прывяло да таго, што пасьля вясеньняга севу 12 гаспадароў вышла з калгасу. Толькі ў маі месяцы РСІ, атрымаўшы матар'ялы на гэтых кіраўнікоў калгасу, расьсьледвала справу, зьняла іх з працы і перадала суду. Пасьля гэтага толькі пачынае наладжвацца праца ў калгасе. Уборку правялі больш-менш здавальняюча. Вялікую дапамогу аказалі профсаюзныя арганізацыі і асабліва чырвонаармейцы.

Лепш за другіх калгасьнікаў працавала ўдарная брыгада калгасьніц, у якую ўваходзілі: **Вайцэховіч Пелагея, Бародзіч Каця, Грыбоўская Таццяна, Вайцэховіч Зося, Траскевіч Ганя і Домна Цімафеева.** Ушасьцярых справіліся яны вязаць снапы за жняяркай, што раней заўсёды рабілі ўвасьмярых. Праўленьне калгасу паставіла іх прэміраваць.

Зараз калгас „Дварэц" мае прыліў 5 гаспадарак. Калгас амаль выканаў свой плян па загатоўках, але яшчэ дрэнна абстаіць справа з апрацоўкай і здачай дзяржаве ільну. Надта позна прыступілі да гэтай працы. Зараз калгас уступіў у сацспаборніцтва з суседнім калгасам па апрацоўцы ільну.

У калгасе, побач з калгасьніцамі-ўдарніцамі ёсьць і такія, якія не давалі сваіх дзяцей у дзіцячы сад для таго, каб можна было ня ісьці на працу.

Наогул надта ненармальна працуе ў вёсцы Дварцы дзіцячы сад. Пакой для саду адведзены даволі вялікі. Маецца мажлівасьць абслужыць усіх бядняцка-серадняцкіх дзяцей вёскі пэўнага ўзросту. Але наведваюць яго чамусьці толькі 10—14 чалавек. Ня створана грамадзкая думка вакол саду. Нават невядома, хто павінен яго забясьпечыць драўмі і таму дзіцячы сад дачакаўся марозаў ня маючы дроў. Слаба працуе загадчыца саду, якая не організоўвае бацькоў для дапамогі саду.

Кіраўнікі сельсавету і калгасу не прыдаюць асобага значэньня саду і нават пакушаюцца на памяшканьне саду, якое хочуць скарыстаць для іншых мэт.

Ёсьць у вёсцы Дварэц ячэйкі КП(б)Б і ЛКСМБ, але яны слаба працуюць. Сярод жанчын ня было цэлы год ніякай працы.

Дэлегатка — сябр праўленьня калгасу Вайцэховіч Пелагея—кажа: „нас толькі ўсё выбіраюць у мінулым годзе і зараз, а працы ніякай з намі не вядуць. Таму і не актыўны ў нас дэлегаткі".

Пелагея—актывістка калгасьніца, зараз ячэйкай і сходам беднаты рэкамэндуецца ў сябры сельсавету. Былая няпісьменная батрачка, яна зараз адна з першых ударніц, актывістка-грамадчыца.

Н.

Чашніцкі раён.



Сартыроўка насеньня да вясковай пасеўнай кампаніі.

Арганізавалі ўдарныя брыгады дэлегатак

7-га сьнежня была праведзена раённая канфэрэнцыя працоўных жанчын, дзе прысутнічала 60 асоб. Стаялі пытаньні аб перавыбарах сельсавету, аб контррэвалюцыйных арганізацыях „прампартыі" і беларускіх нац-дэмакратаў. Канфэрэнцыя пастанавіла арганізаваць пры дэлегацкіх сходах ячэйку Асоавіяхіму, куды ўцягнуць усіх дэлегатак і актывістак.

Для ўзмацненьня існуючых калгасаў і садзейнічаньня арганізацыі новых калгасаў склалася новая ўдарная брыгада.

Канфэрэнцыя пастанавіла, каб кожная актывістка прыняла самы актыўны ўдзел у перавыбарах сельсавету, каб дабіцца 100-процантнага наведваньня перавыбарчых сходаў, правесьці ў новы склад сельсавету ня менш 30 процантаў жанчын, даць жорсткі адпор усім кулакам і падкулачнікам.

Гіліна З.

Межанскі раён.

Бярэце прыклад

Сходы дэлегатак у камуне „Чырвоны артылерыст" Полацкага раёну праводзяцца рэгулярна. З боку саміх дэлегатак маецца вялікая зацікаўленасьць у працы. 12 лепшых дэлегатак уступілі ў партыю і комсамол. Усе дэлегаткі актыўна ўдзельнічалі ў арганізацыі ўсебеларускага Чырвонага абозу. Таксама яны прымаюць актыўны ўдзел па ўцягненьню жанчын-адзінаасобніц у камуну. **Яроменка.**

Парады агранома

Уцяпляйце хлявы для жывёлы

Малая прадукцыйнасьць, альбо нізкія ўдоі жывёлы, залежаць ад кепскага кармленьня, трыманьня ў халодных хлявох, дрэннага дагляду і дрэннай якасьці саміх кароў. Часта прыходзіцца чуць скаргі „дзьве каровы ў двары, а вада на стале". Сапраўды, карова дае ня толькі мала малака, але доіцца яна вельмі кароткі час. Так, сярэдняя сялянская карова, калі дае 13 цэнтнэраў малака ў год, дык з гэтых 13 цэнтнэраў, каля 10 цэнтнэраў атрымоўваецца ўлетку і толькі каля 3-х цэнтнэраў—у вясеньні час. Усю-ж восень і зіму карова ў большасьці стаіць без малака.

Калі падлічыць колькі затрачваецца на карову корму, колькі каштуе ўход і ўтрыманьне каровы пры такім нізкім удоі, дык атрымоўваецца, што карова прыносіць убытак. Выдаткі на яе ўтрыманьне і кармленьне не акупаюцца малаком, якое атрымоўваецца увясну і ўлетку.

Наступным недахопам сялянскай мясцовай жывёлы зьяўляецца яе малая вага. У сярэднім сялянская карова мае вагу ад трох да трох з паловаю цэнтнэраў, але бываюць выпадкі, калі карова мае вагу ўсяго два—два з паловаю цэнтнэра. І толькі больш буйныя каровы важуць 4 цэнтнэры і больш.

Вельмі малыя каровы, вагай у 2 цэнтнэры, ня могуць быць малочнымі. Неабходна ўлічваць і тое, што малая карова праізводзіць дробных цялят, вельмі часта бываюць выпадкі нерасьцёла.

Малая вага мясцовай жывёлы залежыць ад няправільнай злучкі кароў. Звычайна каровы агульваюцца вельмі рана, не дасягаючы і 1½ год. Між тым, у такім узросьце карова сама яшчэ працягвае расьці, калі яна ня злучана. Калі-ж у гэты час карова злучана з быком, дык рост цела затрымоўваецца, і жывёла з кожным годам драбнее.

Ня гледзячы на недахопы нашай жывёлы, калі прыняць меры да паляпшэньня яго кармленьня, утрыманьня і дагляду, дык гэтую-ж жывёлу не пазнаць.

Галоўны недахоп нашай жывёлы—малая прадукцыйнасьць— адхіляецца пры лепшым кармленьні і лепшым падборы жывёлы. Магчыма было-б прывесьці шмат прыкладаў, калі пасьля спробы правільнага кармленьня, мясцовыя каровы даіліся ў 2—3 разы больш.

Побач з добрай малочнасьцю наша мясцовая жывёла адрозьніваецца вельмі тлустым і смачным малаком, напрыклад: лепшыя галяндзкія каровы даюць малака з 2,9 да 3 процантаў тлушчу, наша жывёла дае малака з 4-ма і больш процантамі тлушчу. Кожны лішні процант тлушчу дае лішні кілёграм масла з 100 кілаграмаў малака. Мясцовая жывёла ня толькі здаравей замежнай, але і лягчэй пераносіць розныя захворваньні. Вельмі распаўсюўжаная хвароба—крывавая мача—мацней усяго паражае замежную жывёлу, мясцовая жывёла пераносіць гэтую хваробу значна лягчэй. Наша мясцовая жывёла менш падпадае і другой заразьлівай хваробе—сухотцы, якая вельмі распаўсюджана сярод замежнай жывёлы.

Простыя мерапрыемствы па палепшаньню жывёлаводзтва

Работамі дасьледчых станцый ужо даўно даказана высокая малочная якасьць звычайнай сялянскай жывёлы, калі яе трымаць у правільна абсталяваным (цёплым, сьветлым і чыстым) хлеве. Такая-ж самая жывёла, калі яна трымаецца ў ненармальных умовах (у халодных, брудных і цёмных хлявох), ня можа разьвіць усёй сваёй прадукцыйнасьці (малочнасьці). **З спосабаў узьняцьця прадукцыйнасьці жывёлы перш за ўсё цалкам падыходзіць спрошчанае ўцяпленьне хлявоў для ўсіх відаў жывёлы.** Уцяпленьне хлявоў дае значнае скарачэньне корма і павышае прадукцыйнасьць. Той корм, які раней ішоў на саграваньне цела жывёлы, у цёплых хлявох пойдзе на прырост прадукцыі (мяса, малака і інш.). Калі памяшканьне, дзе знаходзіцца жывёла, вельмі халоднае, дык узімку жывёла большую частку корму есьць дзеля таго, каб падтрымаць цяпло і толькі нязначная частка корму ідзе на атрыманьне адпаведнай прадукцыі.

Каб больш зразумелым была аб прыросьце ўдояў, мяса альбо шэрсьці, у залежнасьці ад становішча хлява, прывядзем прыклад. Прафэсар Гурын падлічыў, што ўцяпленьне хлявоў падвышае ўдоі на 12 процантаў. Гэтыя 12 процантаў лёгка атрымаць, трэба затраціць зусім мала сродкаў на ўпарадкаваньне хлявоў. **Вось чаму ўсім калгасам, якія яшчэ не прыстасавалі хлявоў для ўтрыманьня жывёлы на зімовы час, неабходна тэрмінова ўцяпліць свае хлявы.**

У скразных халодных хлявох, у якіх гной замярзае зімой, шмат лішняга корму ідзе на саграваньне цела жывёлы; акрамя таго з-за скразьнякоў часьцяком жывёла захворвае запаленьнем лёгкіх, асабліва коні, якіх пасьля цяжкай працы потных ставяць у халодныя памяшканьні.

Калі новых хлявоў няма, дык трэба ўцяпліць маючыяся памяшканьні. Бяз столі, нават у бярвенчатых хлявох узімку бывае холадна і марозна, між тым столь, калі няма дошак, магчыма зрабіць з жардзін і на іх паслаць тоўсты пласт саломы, кастры і іншы саломісты корм. У знадворнай сьцяне зрабіць невялікае вакенца, дзьверы абшыць мяхамі, саломай альбо саломеннымі шчытамі. Усе шчыліны ў знадворных сьценках добра праканапаціць пакляй і прамазаць глінай. У гэткіх хутка і проста зацяплёных памяшканьнях гной ужо ня будзе замярзаць. Жывёла сама сябе сагрее тым, што выдзяляе гарачы пар з роту.

У ўцяплёных дварох патрабуецца менш корму жывёле і каровы будуць лепш разьвівацца. Акрамя таго ў уцяплёным хлеве можна даваць цёплы запараны корм і паіць цёплай вадой, тады як ў халодных хлявох гэта рабіць небясьпечна таму, што можна лёгка застудзіць жывёлу.

Ня трэба толькі будаваць душныя, цёмные і дрэнна праветрываемые, так званыя оптанікі для жывёлы. У такіх памяшканьнях жывёла дрэнна есьць, здалікачваецца і лёгка прастуджваецца. Як халодныя, гэтак і вельмі цёплыя памяшканьні зьяўляюцца шкоднымі для здароўя малочнай жывёлы. Самай лепшай тэмпэратурай ў хлеве павінна быць тэмпература ня вышэй 14 градусаў па Рэамюру.

Уцяпляйце-ж хлявы для жывёлы, памятаючы, што толькі ў цёплым, сьветлым і чыстым хлеве жывёла з прыбыткам скарыстоўвае корм.

Агроном-зоотэхнік **Ясінскі.**

„Беларускую работніцу і сялянку“—у масы.

Актыў ёсьць, але кіраўніцтва ня было

(*Талочынскі раён*)

На раённай канфэрэнцыі чытачак і селькорак часопісі „Беларуская Работніца і сялянка“ абгаворваюць пытаньне аб месячніку: часопісь „Беларуская работніца і сялянка“—у масы. Актыўна ўдзельнічаюць прысутнічаючыя, некаторыя крытыкуюць рэдакцыю за тое, што не заўсёды дае адказы на допісы (тт. Сідзельцава, Рахліна). Лаюць пошту за неакуратную дастаўку.

Скардзіцца дэлегатка **Маша Мэтрык**: навербавала я, як упаўнаважаная, 70 падпісчыц у м-ку Слаўнае. Надта неакуратна дастаўляла ім пошта часопісь. Мне былі за гэта няпрыемнасьці, бо падпісчыцы патрабавалі ад мяне часопісь.

А тав. Пярчонак кажа: ёсьць у нас актыў, які не ленаваўся-б працаваць, але парт'ячэйка не кіравала намі. Трэба даць нам напрамак і мы не адмовімся працаваць.

Канфэрэнцыя адзначыла, што працы з часопісьсю ў Талачынскім раёне за апошні час ня было.

Канфэрэнцыя ўзяла на сябе абавязак распаўсюдзіць па раёну 1500 экзэмпляраў часопісі, шляхам садспаборніцтва паміж дэлегацкімі сходамі; арганізаваць пасты рабселькорак, якія будуць пісаць у часопісь. **І. О.**

Падпісваюся і выклікаю

Заслухаўшы інформацыю на агульна-гарадзкім жаночым сходзе, 2-XII-30 году, аб правядзеньні месячніку — часопісь „Беларуская работніца і сялянка“—у масы—бяру на сябе абавязак правесьці 2 сходы жанчын у вёсцы па пытаньням месячніка.

Падпісваюся на часопісь „Беларуская работніца і сялянка“ да канца пяцігодкі і ўнашу грошы, а таксама абавязуюся завербаваць 50 падпісчыц і арганізаваць гурток прыхільнікаў часопісі і селькорак.

Выклікаю пасьледваць майму прыкладу наступных таварышоў: **Гамановіч, Зарэмба, Норку, Цэўлеўскую, Уласікаву, Аўчынікаву, Жылеву, Давыдаву, Шафранскую, Корцаву, Бузаву, Какора Н.**

Тур.

Падняць падпіску на часопісь

На Менскім заводзе „Дрэваапрацоўшчык“ арганізаваўся пост рабкорак часопісу „Беларуская работніца і сялянка“. Але, на вялікі жаль, ён дрэнна працуе.

Большасьць старых работніц, якія лічаць сябе актыўнымі і павінны быць наперадзе ўсіх кампаній, у нас не адчуваецца. Калі гаворыш з старой работніцай актывісткай т. Шыкаўка, што трэба пачаць працу па распаўсюджваньню часопісі, што кожная работніца павінна выпісваць часопісь, дык яна адказвае: „Я вучуся і болей нічога рабіць не магу“.

Упаўнаважаныя па падпісцы часопісі т. Хазанава і Ясюкевіч нядбайна адносяцца да сваіх абавязкаў, яны ня цікавяцца, каб растлумачыць работніцам значэньне часопісі, каб разгарнуць працу па падпісцы.

У часе месячніку ўпаўнаважаныя павінны ўдарным тэмпам узяцца за справу, каб дзьвінуць уперад падпіску. Трэба, каб актыў старых работніц аказалі дапамогу, каб растлумачылі, што праз часопіс мы выхоўваем новыя кадры, клясава-сьвядомых работніц.

Яхновіч.

Арганізавалі пост рабкорак часопісі

Паккамерны цэх папяровай фабрыкі ў Чашніках пасьля дакладу аб месячніку—часопісь „Беларуская работніца і сялянка“—у масы, вылучыў упаўнаважаных па падпісцы і арганізаваў пост рабкорак, у які запісалася 4 работніцы.

Г. О.

Чашнікі.

Нашы прапановы

На дэлегацкім сходзе калгасьніц калгасу „Зьвязда“ абгаварвалася пытаньне аб месячніку „часопісь „Беларуская Работніца і Сялянка“ у масы“. Была праведзена гутарка аб тым вялікім значэньні, якое мае для працоўных жанчын часопісь. Дэлегаткі выказвалі свае думкі адносна часопісі:

Пажадана, каб больш было дадаткаў выкраек для шыцьця і ўзораў для вышываньня. Неабходна больш ілюстраваць часопісь здымкамі дасягненьняў калгасаў: новых будынкаў, машын і гэтак далей, а таксама здымкамі лепшых калгасьніц і грамадчыц. Неабходны сыстэматычныя лекцыі па ахове рабочага здароўя. Больш асьвятляць у часопісі жыцьцё калгасаў як станоўчыя, так і адмоўныя бакі яго. Завесьці аддзел пытаньняў і адказаў, у якім даваць адказы на розныя пытаньні чытачоў.

А галоўнае, гэта трэба зьнішчыць неакуратную, дрэнную дастаўку часопісі, бо, як правіла, гадавыя і паўгадавыя падпісчыкі атрымліваюць толькі 75—80 працэнтаў нумароў часопісі, астатнія дзесь прападаюць у нэтрах пошты. Гэта вельмі перашкаджае вярбоўцы падпісчыкаў на часопісь.

Дэлегаткі—чытачкі часопісі выказваліся, што „Беларуская работніца і сялянка“ вельмі каштоўная часопісь, бо яна ўздымае культурна-палітычны ўзровень і дапамагае ў штодзённым жыцьці. Кожная працоўная жанчына павінна выпісаць „Беларускую работніцу і сялянку“.

Дэлегаткі пачалі тут-жа на сходзе падпісвацца на часопісь. Падпіска працягваецца.

Сьмілавіцкі раён. **Настаўніца.**

Работніцы ў гладзільнай машыны.

Парады ўрача.

Шкарлятына.

Шкарлятына—заразьлівая хвароба, якая вельмі лёгка перадаецца ад хворага здароваму і такім чынам хутка распаўсюджваецца. Досыць аднаго разу кароткатэрміновага прабываньня каля шкарлятынага хворага, каб ужо заразіцца. Хвароба можа перадавацца і праз прадметы, якія былі ў ужыванні хворага, асабліва праз бялізну, вопратку, мэблю, цацкі, сшыткі, кнігі і гэтак далей. Атрута шкарлятыны вельмі стойкая. Прадметы, да якіх хворы датыкаецца, захоўваюць сваю заразьлівасьць на працягу месяцаў, таму ўсе рэчы малакаштоўныя трэба спаліць, а астатнія прадэзынфэкцыраваць. Сам хворы зьяўляецца заразьлівым на працягу шасьці тыдняў і нават больш: пагэтаму раней гэтага тэрміну ня трэба дапускаць зносін паміж выздараўліваючым і здаровым дзіцяцяй.

Шкарлятынай захворваюць часьцей усяго дзеці ад двух да 10-ці год. На працягу першага году жыцьця шкарлятына сустракаецца рэдка. Дарослыя хоць і рэдка, але таксама заражаюцца шкарлятынай. Асабліва вялікую схільнасьць да захворваньня шкарлятынай маюць радзільніцы. Хто хварэў шкарлятынай, у другі раз захворвае вельмі рэдка.

Шкарлятына—адна з самых небясьпечных і цяжкіх хвароб дзіцячага ўзросту. Яна застаўляе пасьля сябе шмат ускладненьняў. З гэтых ускладненьняў ёсьць настолькі небясьпечныя, што дзіця, лёгка перанёсшы шкарлятыну, можа загінуць ад аднэй з дадатковых хвароб. Іншыя ўскладненьні (напрыклад, хваробы сэрца) могуць застацца на ўсё жыцьцё, ад запаленьня суставаў пасьля шкарлятыны можа дзіця і стаць калекай. Мы бачым зараз, якая цяжкая і небясьпечная хвароба шкарлятына. Вось чаму бацькам трэба ведаць, што гэта за хвароба, як усьцерагчы дзіця ад захварэньня.

Шкарлятына пачынаецца адразу, сярод поўнага здароўя. Яна вельмі хутка ўкладвае сваю ахвяру ў пасьцель. Яшчэ раніцай дзіця было зусім здарова, і зусім хутка ў яго пачынаецца моцны жар, баліць галава, агульнае недамаганьне, потым ваніты і боль у горле, праз некалькі гадзін пасьля пачатку хваробы па ўсяму целу дзіцяці зьяўляецца дробная чырвоная сыпка ў выглядзе паасобных ярка-чырвоных кропак і скура дзіцяці здаецца чырвонаю, як кумач. Сыпка зьяўляецца і на твару, на ілбу, шчаках і вушах, між тым нос, падбародак і губы застаюцца бледнымі і, наадварот, зьяўляецца бледны трохкутнік. Язык з пачатку абкладзены, потым пачынае ачышчацца і на 4 ты—5 дзень хваробы набывае ярка-чырвоную афарбоўку (малінавы язык). Шкарлятынная сыпка трымаецца 4—5 дзён, а потым яна пачынае бляднець і паступова праходзіць.

Першыя дні хваробы хворае шкарлятынай дзіця адчувае сябе вельмі дрэнна, у яго жар, яно скардзіцца на боль пры глытаньні і ў цяжкіх выпадках часьцяком губляе прытомнасьць і пачынае брэдзіць. Цяжкае становішча пры шкарлятыне звычайна цягнецца 7—8 дзён так, што з пачатку другога тыдню хворы пачынае адчуваць сябе лепш. Жар у яго праходзіць, боль у глотцы зьнікае і застаецца толькі моцная слабасьць. На 2-м альбо 3-м тыдню хваробы пачынаецца лушчэньне скуры, якая лушчыцца лускамі па ўсяму целу. Так часьцей усяго працякае сярэдняя форма шкарлятыны.

Часьцяком шкарлятына сустракаецца ў лёгкай форме, прычым жар бывае невялікі, трымаецца 1—3 дні. Сыпка вельмі бледная, хутка знікае, нават бываюць выпадкі шкарлятыны і бяз сыпкі. Гэткую шкарлятыну дзіця пераносіць на нагах. Бацькі амаль ня ведаюць, чым яно хварэе. Гэтыя лёгкія выпадкі шкарлятыны асабліва небясьпечны для акаляючых таму, што такое хворае дзіця не ізалюецца, а працягвае заставацца сярод здаровых дзяцей і заражае іх усіх шкарлятынай.

Такія лёгкія выпадкі могуць даць цяжкія ўскладненьні ў выглядзе запаленьня почак.

У час эпідэміі часьцяком зьяўляюцца вельмі цяжкія небясьпечныя выпадкі, якія канчаюцца сьмерцю ў першыя суткі альбо на другі, трэці дзень (раптоўная, як маланка, шкарлятына).

Пры шкарлятыне часьцяком у хворага зьяўляецца запаленьне шыйных залоз, прычым залозы прыпухаюць, можа зьявіцца скула, якую неабходна ўскрыць.

Другое ўскладненьне—припухласьць і боль у суставах. Частым ускладненьнем зьяўляецца запаленьне сярэдняга вуха, якое звычайна канчаецца гнояцечай вуха. Запаленьне сярэдняга вуха часьцяком канчаецца глухатою. Адным з самых частых і небясьпечных ускладненьняў зьяўляецца вострае запаленьне почак, якое звычайна наступае ў канцы 3-га тыдню альбо спачатку 4 га тыдню. Пры гэтым у хворага зьяўляюцца ацёкі твару, павек і амаль усяго цела. Такі хворы мала выдзяляе мачы, а ў цяжкіх выпадках бывае затрымка мочавыдзяленьня. Такія выпадкі вельмі сур'ёзныя, таму што ў выніку затрымкі ў арганізьме шкодных матэрый, звычайна выдзяляючыхся з мачой, у хворага зьяўляюцца прыпадкі, якія суправаджаюцца згубай прытомнасьці і сутаргамі.

Лячыць хворага шкарлятынай мэтазгодней у бальніцы, чым дома. У бальніцы за ім будзе забясьпечаны належны дагляд і лячэньне, а ўсе акаляючыя будуць выратаваны ад небясьпекі заражэньня.

Калі-ж хворы чаму-небудзь застаецца дома, дык трэба паклікаць урача і пры дагляду за хворым сачыць за наступнымі правіламі: Перш за ўсё хворага трэба зусім аддзяліць ад усіх іншых членаў сям'і (зьмясьціць у асобны пакой), а астатніх дзяцей лепш за ўсё удаліць з дому. Пакой хворага павінен быць чысты і сьветлы і яго неабходна часта праветрываць, часьцей мыць падлогу, зьмяняць бялізну хвораму, умываць яго. Трымаць хворага на малацы і малочнай дыеце (суп і каша). У час моцнага жару на галаву класьці ручнік, змочаны ў халоднай вадзе, альбо пузыр са льдом. Старшыя дзеці павінны часта паласкаць рот борнай кісласьцю (гарбатная лыжка борнай кісласьці на стакан цёплай вады). Малым дзецям трэба праціраць рот гэтым-жа растворам. Так як дарослыя таксама могуць заразіцца шкарлятынай нават у цяжкай форме, то мацеры і іншыя, якія даглядаюць хворых, павінны падтрымліваць вялікую асьцярожнасьць, часьцей мыць рукі і не цалаваць хворых дзяцей.

Хворы павінен заставацца ня менш 3-х тыдняў у ложку, нават, калі ў яго лёгкая форма шкарлятыны,

Цана асобнага нумару 10 кап.

1964 г.

асцатнім дзецям, калі яны маюцца ў хаце, трэба зрабіць супро[ш]шкарлятынныя папярэджваючыя прышчэпкі. Прышчэпкі гэтыя зусім бясшкодны і пасьля іх (праз 2—3 тыдні) дзіця робіцца няўспрыймальным да захворваньня шкарлятынаю. Праўда, адзначаныя выпадкі, калі дзеці захворвалі шкарлятынай і пасьля атрыманьня папярэджваючай прышчэпкі, але такіх выпадкаў вельмі мала і сама шкарлятына праходзіла [ў]х у шмат разоў лягчэй, чым у тых, хто ня м[е]прышчэпкі.

Але як-бы небясьпечна ні была шкарлятына, яе ўсё-ж магчыма асьцерагчыся, калі памятаць і сачыць за наступнымі парадамі і правіламі: 1. Ня трэба наведваць кватэры, дзе маюцца хворыя дзеці, ня трэба браць адтуль якія-б та ні было рэчы, ня трэба наведваць хаўтуры памершых ад шкарлятыны. 2. Абстрыгаць валасы і ногці каротка. 3. Штотыднёва мыць галаву. 4. Перад ядою і пасьля ежы мыць рукі вадой і мылам. 5. Перад ядой і пасьля ежы, перад уходам у школу і пасьля прыходу з школы—прапаласківаць горла растворам борнай кісласьці. 6. Ня піць вады з агульнай пасуды. 7. Ня браць кнігі, сшыткі, алоўкі і гэтак далей у другога. 8. Раніцай і ўвечары чысьціць зубы. 9. Ня піць малака і вады ў сырым выглядзе. 10. Раніцай і ўвечары праветрываць кватэру. 11. Не ўваходзіць у спальню ў верхнім адзеньні і галёшах. 12. Па прыходзе з школы надзець хатнюю вопратку. 13. Як толькі забаліць горла, хутка зьвярнуцца да ўрача. Бароцца з заразаю трэба паветрам, сьветам, чыстатою і захаваньнем правіл гігіены.

Доктар **Царфін.**

Што зроблена па допісах рабселькораў?

Праца з беднатой наладжана.

На заметку „Трэба вышукваць врэдных людзей“ Круглянскі РК КП(б)Б паведамляе, што праца з беднатой у в. Улужжа наладжана. Цяцерынскай ячэйкай КП(б)Б прымацован партыец для сталай працы з беднатой.

Неабходна адзначыць, што допіс селькоркі [м]арынаваўся Круглянскім РК дзевяць месяцаў.

За няпрыняцьце вылучэнкі—вымова.

Селькорка з ст. Слаўнае пісала нам аб тым, што Старшыня Праўленьня Славенскай Спажыўкааперацыі т. Каласуноў і загадчык крамы Левін ня прынялі на працу вылучэнку-дэлегатку Мэтрык.

Гэты допіс разглядаўся Талачынскай РСІ, якая прапанавала Праўленьню Спажыўтаварыства ў 3-хдзённы тэрмін прыняць тав. Мэтрык на працу. За няпрыняцьце яе раней Каласунову і Левіну абвешчана вымова.

Міхайлаў атрымаў папярэджаньне.

Селькорка з Брагінскага раёну пісала нам аб настаўніку Манейскай школы Міхайлава, які ў дзень каляд закрыў школу.

Брагінскі інспэктар Нарасьветы паведамляе, што Міхайлаву зроблена папярэджаньне.

Паштовая скрыня.

П. Хваёваму—Допіс „Прыняць меры“ ня пойдзе. Допіс спазьніўся.

Лявіцкаму Ц.—Перавыбары дэлегацкіх сходаў закончаны. Допіс ня пойдзе, за адсутнасьцю фактаў.

Фрумкінай—Напішэце аб тым, як працуюць Гомельскія дэлегаткі новага складу.

Дзяўчыне—Допіс „Ня жыцьцё, а гора“—трэба зьмясьціць у насьценгазэце.

Жураўлёвай—Допіс „Камісія на паперы“ падыходзіць для насьценгазэты.

„Беларуская Работніца і Сялянка“

з студзеня 1930 году выходзіць 3 разы ў месяц.

Падпіску можна здаваць на пошту, лістаносцам, у кіёскі ці прысылаць у выдавецтва „Зьвязда“ (Савецкая, 63).

Часопіс каштуе— 1 месяц: . . . . 20 капеек | Паўгода. . . 1 р. 20 капеек
3 месяцы . . . 60 „ | Год . . . . 2 „ 40 „

Цана асобнага нумару 10 кап.

Упаўнаважаныя на падпіскі атрымоўваюць 10 проц. з сабранай сумы.

Кожная актывістка, грамадчыца, дэлегатка, работніца, калгасьніца, саўгасьніца, бядняцка і серадняцка—павінна чытаць сваю часопіс „БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА“.

Кожная актывістка павінна распаўсюджваць гэту часопіс.

Чытайце, распаўсюджвайце і пішэце ў сваю часопіс.

Адрас рэдакцыі: Менск, вул. Энгельса, 28, тэлефон—5-85.

Выданьне **ЦК КП(б)Б.**

Рэдактары **Н. Бурава, Г. Рагазіньнікава**

Друкарня імя Сталіна. Заказ № 2855. У ліку 9600 Галоўлітбел № 857.